Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЖНІВЕНЬ 10 СУБОТА 1940 год № 23 (479) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНА-СТАЛІНА — ШАСНАЦЦАЦЬ СОВЕЦКІХ РЭСПУБЛІК!

Дні работ Сёмай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання, дні прыняцця мудрых законаў, пашыраючых шчаслівую сям'ю вялікіх совецкіх народаў—новая залатая старонка гісторыі нашай радзімы, гісторыі прагрэса і культуры чалавецтва. Гэтыя дні панясуць у вякі нязгасную славу велічы перамог ленінска-сталінскай палітыкі дружбы народаў.

Дні работ Сёмай Сесіі з'явіліся радасным святам для ўсяго совецкага народа. Рашэнні Сесіі з найвялікшай паўнатой і яскравасцю выразілі думы і пачуцці, спадзяванні і мары, адзіную волю народаў дружнай совецкай сям'і.

Сесія заслухала даклад Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. Молатава аб знешняй палітыцы Совецкага Саюза. Таварыш Молатаў даў бліскучы аналіз міжнароднага становішча і з вычарпальнай яснасцю акрэсліў мудрую сталінскую палітыку совецкага ўрада—палітыку міра, няспыннага пабеданоснага руху нашай радзімы наперад да новых і новых перамог, няўхільнага ўмацавання магутнасці і мабілізацыйнай гатоўнасці Совецкага Саюза.

Сёмая Сесія Вярхоўнага Совета СССР аднадушна ўхваліла знешнюю палітыку ўрада. Народныя абраннікі выказалі агульную думку совецкага народа, горача ўхваляючага паслядоўную і непахісную палітыку свайго ўрада—палітыку, якая забяспечвае выдатныя поспехі развіцця і ўмацавання Совецкага Саюза.

Вышэйшы орган улады Совецкай дзяржавы — Вярхоўны Совет СССР заслухаў заявы паўнамоцных прадстаўнікоў народаў, якія, разарваўшы праклятыя ланцугі капіталізма, сталі пад непераможны Чырвоны Сцяг. На крэмлёўскую трыбуну выходзілі лепшыя сыны і дочкі малдаўскага, літоўскага, латвійскага, эстонскага народаў. Яны ўспаміналі сваё нядаўняе мінулае — чорныя дні прыгнёту, бяспраўя, галечы, капіталістычнага рабства. Яны гаварылі аб сёнешнім — радасных днях вызвалення, пачатку шчаслівага жыцця народа, стаўшага гаспадаром сваёй зямлі, свайго лёсу, сваёй будучыні. Яны выказвалі аднадушнае жаданне паслаўшых іх народаў: жыць у братняй сям'і Совецкага Саюза. Яны віталі горача, усхвалявана, натхнёна — словамі вялікай любві і глыбокай удзячнасці — правадыра, настаўніка і друга народаў вялікага Сталіна.

Вярхоўны Совет СССР, выказваючы думку і волю ўсіх працоўных краіны соцыялізма, з вялікім уздымам аднадушна, брапкі прыняў у дружную сям'ю Совецкага Саюза народжаныя пад крэмлёўскімі зорамі новыя Саюзныя рэспублікі.

Створана Саюзная Малдаўская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка. Ажыццявілася мара праслаўленага народнага героя — чырвонага палкаводца Грыгорыя Катоўскага, здзейсніліся жаданні малдаўскага і украінскага народаў, адноўлена справядлівасць: на беразе сіняга Дуная палымнеюць сцягі нашай радзімы. Совецкая Бесарабія і Совецкая Букавіна, у складзе Малдаўскай ССР і Украінскай ССР, у самы хуткі час дасягнуць цудоўнага соцыялістычнага росквіту.

Прынята ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік у якасці роўнапраўнай Саюзнай рэспублікі Літоўская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка. Совецкая Літва — бліжэйшая суседка Совецкай Беларусі. І ад імя ўрада БССР і ЦК КП(б)Б дэпутат тав. П. К. Панамарэнка ўнёс на разгляд Сесіі прапанову аб далучэнні да Літоўскай ССР Свенцянскага раёна і частак іншых раёнаў БССР з пераважным літоўскім насельніцтвам. У гэтай прапанове адлюстраваліся пачуцці братняй дружбы і павагі беларускага народа да народа Літвы, знайшла сваё яскравейшае выяўленне мудрая ленінска-сталінская нацыянальная палітыка роўнапраўя і дружбы народаў. Прапанова дэпутата тав. П. К. Панамарэнка прынята Сесіяй. У сям'і совецкіх рэспублік адбылося гістарычнае з'яднанне ўсяго літоўскага народа.

Як роўнапраўныя Саюзныя рэспублікі, прыняты ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік Латвійская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка і Эстонская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

«Няма ніякага сумнення ў тым, што ўваходжанне гэтых рэспублік у Совецкі Саюз забяспечыць ім быстры гаспадарчы ўздым і ўсебаковы росквіт нацыянальнай культуры, што ўваходжаннем у Совецкі Саюз іх сілы будуць у многа разоў умножаны, іх безапаснасць будзе ўмацавана і, разам з тым, яшчэ больш узрасце магутнасць Вялікага Совецкага Саюза». (В. М. Молатаў).

Краіна соцыялізма з матчынымі клопатамі і ласкай сустрэла і прыняла ў сваю сям'ю дзесяць мільёнаў новых совецкіх грамадзян.

Сонца Сталінскай Канстытуцыі — над вольнымі совецкімі землямі Бесарабіі, Букавіны, Прыбалтыкі!

Вырасла сям'я совецкіх народаў. Пашырыліся граніцы совецкай зямлі. І каб яшчэ больш узняць славу і магутнасць сваёй радзімы, совецкі народ павінен быць «у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць», ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі застаць нас знянацку». Гэты сталінскі наказ напомніў з трыбуны Сесіі таварыш Молатаў.

Законы, прынятыя VII Сесіяй Вярхоўнага Совета СССР маюць найвялікшае міжнароднае значэнне. Яны дэманстрыруюць усяму свету трыумф сапраўднага дэмакратызма і роўнапраўнасці народаў, магутнасць ленінска-сталінскага вучэння, сілу ідэі совецкай улады — ідэі, якая выводзіць народы з капіталістычнага змроку на сонечны шлях соцыялістычнага росквіту. Яны ўзнімаюць значэнне і аўтарытэт Совецкага Саюза ў вырашэнні пытанняў сусветнага жыцця.

Пад пабеданосным сцягам Леніна — Сталіна, пад мудрым вадзіцельствам вялікага правадыра таварыша Сталіна ідуць шаснаццаць братніх совецкіх рэспублік, ідзе магутны 193-мільённы совецкі народ да новых перамог комунізма!

Сёмая Сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

Законы, прынятыя Вярхоўным Советам СССР

Закон аб утварэнні Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі

Ідучы насустрач пажаданням працоўных Бесарабіі і працоўных Малдаўскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі аб з'яднанні малдаўскага насельніцтва Бесарабіі з малдаўскім насельніцтвам Малдаўскай АССР і кіруючыся совецкім прынцыпам свабоднага развіцця нацыянальнасцей, Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

1. Утварыць Саюзную Малдаўскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

2. Уключыць у састаў Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі горад Тіраспаль і Грыгорыопальскі, Дубасарскі, Каменскі, Рыбніцкі, Слабадзейскі і Тіраспальскі раёны Малдаўскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, горад Кішынёў і Бельцскі, Бендэрскі, Кішынёўскі, Кагульскі, Оргееўскі і Сарокскі паветы Бесарабіі.

3. Перадаць у распараджэнне Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прамысловыя прадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Бесарабіі і Малдаўскай АССР, згодна пункта другога гэтага закона, за выключэннем невялікай колькасці прадпрыемстваў, маючых агульнасаюзнае значэнне.

4. Прасіць Вярхоўны Совет Украінскай ССР і Вярхоўны Совет Малдаўскай ССР прадставіць на разгляд Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік праект устанаўлення дакладнай граніцы паміж Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

5. Правесці ў адпаведнасці з арт. арт. 34 і 35 Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік ад Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

6. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік назначыць дзень выбараў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 2 жніўня 1940 года.

Закон аб уключэнні Паўночнай часткі Букавіны і Хоцінскага, Акерманскага і Ізмаільскага паветаў Бесарабіі ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

1. Уключыць Паўночную частку Букавіны і Хоцінскі, Акерманскі і Ізмаільскі паветы Бесарабіі ў састаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

2. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета СССР назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік ад насельніцтва новых тэрыторый Украінскай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 2 жніўня 1940 года.

Закон аб прыняцці Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік

Заслухаўшы заяву Паўнамоцнай Камісіі Сейма Літвы, Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

1. Задаволіць просьбу Сейма Літвы і прыняць Літоўскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік у якасці роўнапраўнай Саюзнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

2. Прыняць прапанову Вярхоўнага Совета Беларускай ССР аб перадачы ў састаў Саюзнай Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі Свенцянскага раёна і часткі тэрыторыі з пераважаючым літоўскім насельніцтвам Відзоўскага, Гадуцішкаўскага, Астравецкага, Воранаўскага, Радунскага раёнаў Беларускай ССР.

3. Прасіць Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і Вярхоўны Совет Саюзнай Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі прадставіць на разгляд Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік праект устанаўлення дакладнай граніцы паміж Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Саюзнай Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

4. Правесці у адпаведнасці з арт. арт. 34 і 35 Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Саюзнай Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

5. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета СССР назначыць дзень выбараў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 3 жніўня 1940 года.

Закон аб прыняцці Латвійскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік

Заслухаўшы заяву Паўнамоцнай Камісіі Сейма Латвіі, Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

1. Задаволіць просьбу Сейма Латвіі і прыняць Латвійскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік у якасці роўнапраўнай Саюзнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

2. Правесці ў адпаведнасці з арт. арт. 34 і 35 Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Саюзнай Латвійскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

3. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета СССР назначыць дзень выбараў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 5 жніўня 1940 года.

Закон аб прыняцці Эстонскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік

Заслухаўшы заяву Паўнамоцнай Камісіі Дзяржаўнай Думы Эстоніі, Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

1. Задаволіць просьбу Дзяржаўнай Думы Эстоніі і прыняць Эстонскую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку ў Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік у якасці роўнапраўнай Саюзнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

2. Правесці ў адпаведнасці з арт. арт. 34 і 35 Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Саюзнай Эстонскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

3. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік назначыць дзень выбараў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 6 жніўня 1940 года.

Закон аб змяненні і дапаўненні артыкулаў 13, 23 і 48 Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР

У сувязі з утварэннем Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і прыняццем у Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік Саюзнай Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, Саюзнай Латвійскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і Саюзнай Эстонскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, унесці змяненні і дапаўненні ў артыкулы 13, 23 і 48 Канстытуцыі (Асноўнага Закона) СССР, выкладаўшы гэтыя артыкулы наступным чынам:

«Артыкул 13. Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік ёсць саюзная дзяржава, утвораная на аснове добраахвотнага аб'еднання роўнапраўных Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік:

Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Азербайджанскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Грузінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Армянскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Туркменскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Узбекскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Таджыкскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Казахскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Кіргізскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Карэла-Фінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Латвійскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі,
Эстонскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі».

«Артыкул 23. Украінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка састаіць з абласцей: Акерманскай, Вінніцкай, Валынскай, Варашылаўградскай, Днепрапятроўскай, Драгабычскай, Жытомірскай, Запарожскай, Каменец-Падольскай, Кіеўскай, Кіраваградскай, Львоўскай, Нікалаеўскай, Одэскай, Палтаўскай, Ровенскай, Сталінскай, Станіслаўскай, Сумскай, Тарнопальскай, Харкаўскай, Чарнігаўскай і Чэрнавіцкай».

«Артыкул 48. Вярхоўны Совет СССР выбірае на сумесным пасяджэнні абодвух палат Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР у саставе: Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, шаснаццаці яго Намеснікаў, Сакратара Прэзідыума і 24 членаў Прэзідыума.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР падаждотны Вярхоўнаму Совету СССР ва ўсёй сваёй дзейнасці».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 7 жніўня 1940 г.

Аб выбранні тав. КУУСІНЕНА О. В. Намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

Выбраць тав. Куусінена Отто Вільгельмавіча Намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 7 жніўня 1940 г.

САЛАМЕЯ НЕРЫС

літоўская паэтэса — дэпутат Народнага Сейма Літвы.

ПАЭМА АБ СТАЛІНЕ

(Урывак)

Табе, наш бацька, родны Сталін,
Табе, магутная Масква,
За волю, што на век нам далі,
Падзяку шле мая Літва!

Свяціла Сталіна вучэнне
Усім працоўным на зямлі,
Але з турэмных сутарэнняў
Мы сонца бачыць не маглі.

Былі шляхі ўсе нам адрэзаны,
Быў родны край для нас турмой
Былі нам рукі дротам зрэзаны
І мы не зналіся з вясной.

Як заклікаў нас аганёк,
Што за кардонам, побач з намі!
Мы доўга на яго здалёк
Глядзелі прагнымі вачамі.

Мы ведалі: там край герояў,
Наперад Сталін іх вядзе.
І слава іх праз межы, горы,
Наўсцяж па ўсёй зямлі ідзе.

Там воля Сталіна шырока
Адкрыла к шчасцю ўсім пуці.

Чаму ж ад шчасця мы далёкі,
Няўжо нам волю не знайсці?..

Ды Сталін к сонцу шлях адзіны
Адкрыў для ўсіх зямных плямён.
І для Літвы — мае радзімы
Стаў явай казачнаю сон.

Прарочыць сталінскае слова
Жыццё народам, катам смерць.
Над краем над маім вясёлым
Сцягам чырвоным век гарэць!

Чырвонаармейцы на граніцы
Народа волю берагуць.
Пяюць пра іх лясы, крыніцы,
Жанкі, што жыта ў полі жнуць.

Таварышы мае на волі,
Не пагражае ім турма.
Свабодна мысль, свабодна слова,
Рассеяна навекі цьма

Нас сонца — Сталін ласкай песціць,
Адкрыў к жыццю дарогу ён.
Аб ім Літва спявае песні,
Яму кладзе Літва паклон.

Пераклаў **Ан. АСТРЭЙКА.**

Да 20-годдзя ЛКСМБ

У верасні гэтага года спаўняецца 20 год Ленінскага комуністычнага саюза моладзі Беларусі.

Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ рашыў выдаць да гэтай гадавіны дзве кнігі: брашуру (у дапамогу дакладчыкам і агітатарам) па гісторыі ЛКСМБ і вялікі літаратурна-мастацкі зборнік аб жыцці і дзейнасці ЛКСМБ.

Зараз праходзіць узмоцненая падрыхтоўка да выдання гэтых кніг.

У літаратурна-мастацкім зборніку прымае ўдзел звыш 40 аўтараў. Сярод іх народныя паэты БССР ордэнаносцы Янка Купала, Якуб Колас, пісьменнікі-ордэнаносцы тт. Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка.

У літаратурна-мастацкі зборнік уключацца артыкулы, нарысы, апавяданні, вершы, урыўкі з паэм. У гэтых матэрыялах расказваецца аб партыі Леніна — Сталіна, арганізатару і правадыру комсамола, аб першых кроках работы комсамола Беларусі з дня яго нараджэння, аб незабыўных днях грамадзянскай вайны, аб удзеле комсамола ў дзяржаўным і гаспадарчым будаўніцтве краіны Советаў, аб дзейнасці ЛКСМБ на культурным фронце, аб удзеле комсамольцаў у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, аб гатоўнасці комсамола да абароны граніц соцыялістычнай радзімы.

Героям Совецкага Саюза, выхаванцам комсамола Беларусі таварышам Саламонікаву, Гармаза, знатным маладым рабочым і работніцам, калгаснікам і калгасніцам, маладым настаўнікам, вучоным, артыстам, пісьменнікам, чырвонаармейцам — лепшым сынам і дочкам герaічнага беларускага народа прысвячаюцца шматлікія матэрыялы зборніка.

У МАСТАКОЎ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ

Брыгада мастакоў, вылучаная праўленнем Саюза совецкіх мастакоў БССР, прабыла на працягу двух тыдняў у Беластоку і іншых гарадах заходніх абласцей, маючы асноўнай задачай — аказаць творчую і арганізацыйную дапамогу мясцовым мастакам у падрыхтоўцы да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Брыгада прагледзела работы і эскізы да выстаўкі ў 50 мастакоў Беластока і Брэста. Многа мастакоў мы наведалі на даму, у майстэрнях. Былі праведзены адкрытыя пасяджэнні выстаўкома з удзелам мастацкай грамадскасці. Члены брыгады — мастакі-ордэнаносцы Пашкевіч і Зайцаў інфармiравалі мастакоў Беластока аб творчым жыцці Мінска, Масквы і Ленінграда, аб значэнні такіх важных культурна-палітычных мерапрыемстваў, праводзімых партыяй і ўрадам, як усесаюзныя выстаўкі: «Наша радзіма», «Гісторыя ВКП(б)», абаронная выстаўка да 60-годдзя таварыша Варашылава.

У пераважнай большасці мастакі Беластока актыўна рыхтуюцца да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Вельмі радасна, што многія з іх праяўляюць ініцыятыву ў сэнсе папаўнення выстаўкі працамі больш актуальнага зместу, чым тэмы, навязаныя ім некаторымі работнікамі абласнога аддзела мастацтва. Так, скульптар Смурло дадзеную яму тэму «Комсамолка» канкрэтызаваў і працуе зараз над кампазіцыйнай фігурай «Комсамолка-трактарыстка». Брыгада адмяніла такія абстрактныя тэмы, рэкамендаваныя мастакам тав. Сокаловым (абласны аддзел мастацтваў), як «Стол знатнага чалавека». Многія мастакі з вялікім энтузіязмам узяліся за выкананне прапанаваных імі-ж тэм. Малады і таленавіты мастак Ляндау прадставіла брыгадзе ўдалы накід кампазіцыі «Перадача вопыта». Сюжэт яго ўзят на адным з тэкстыльных прадпрыемстваў Беластока. Мастак Разенецкі працуе над тэмай «Рабочая сям'я раней і цяпер». На вялікім палатне будзе паказана рабочая сям'я ва ўмовах падпольнай працы ў белапанскай Польшчы і быт гэтай сям'і сёння, у совецкіх умовах.

Прагледжана ў Беластоку і Брэсце больш 200 работ і эскізаў. Выяўлены вельмі цікавыя па творчасці сілы. Можна назваць групу старэйшага пакалення мастакоў, як А. М. Берман, Б. Р. Ральніцкі, С. Ю. Цэнтнершвер, якія маюць багаты вопыт у галіне рысунка, арыгінальную манеру пісьма, а галоўнае — рэалістычна адлюстроўваюць рэчаіснасць. Вядома, можна папракнуць Бермана (па раду ранейшых работ) ва ўтончанасці, салоннасці. Ёсць недахопы жывапіснага парадку ў Цэнтнершвер, але, у той-жа час, яе акварэльныя работы вельмі цікавыя, своеасаблівыя па колеру і прастору. Гэтая група мастакоў актыўна працуе над сучаснай тэматыкай: «1 мая ў Беластоку», «Сустрэча Чырвонай Арміі» і інш. Мы бачылі некаторыя іх работы да выстаўкі, пераведзеныя на палатно, работы, якія абяцаюць быць цікавымі па ідэйнаму замыслу і ў жывапісных адносінах.

З маладых мастакоў, якія з энтузіязмам і сур'ёзна рыхтуюцца да выстаўкі, можна назваць тт. Краеўскага, Ляндау, Малярэвіч, Кшэчаноўскага, Гельман, Мандэльцвайга, Тыбера і інш. Заслугоўваюць увагі работы тав. Кшэчаноўскага «Тэкстыльны камбінат № 5», «Сяляне ў рабочай гвардыі» і інш. Кшэчаноўскі — добры графік і змог у межах гэтай галіны выяўленчага мастацтва, ва ўласцівай яму манеры, паказаць сялян Заходняй Беларусі ў гістарычныя дні верасня 1939 года, а таксама нашу, совецкую фабрыку. Мастак Гельман з вялікім пачуццём працуе над такімі тэмамі, як «Праполка» ці «Калгасны статак на вадапоі». Эскіз яе «Калгасны статак на вадапоі» быў прадстаўлен у такім выглядзе, што брыгада палічыла патрэбным набыць яго як гатовы твор.

Шмат культуры ў прагледжаных намі работах мастакоў Малярэвіч і Краеўскага. Абодва яны сур'ёзна і добрасумленна адносяцца да выканання заказаў карцін для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Трэба ў той-жа час адзначыць рад недахопаў у творчасці мастакоў заходніх абласцей БССР.

Агульным недахопам, характэрным для прагледжаных намі шматлікіх работ мастакоў Беластока і, у асаблівасці, Брэста, з'яўляецца слабы жывапіс, неахайныя адносіны да рысунка, няўменне будаваць кампазіцыю. Пры ўсёй шчырасці, у радзе прадстаўленых эскізаў і работ адчуваецца, што аўтарам нехапае палітычнага кругагляду і прафесіянальнага навыку для ажыццяўлення тэмы. На другіх работах ляжыць адзнака фармалістычных і іншых буржуазных уплываў. У часе аднаго з праглядаў, арганізаваных брыгадай, былі падвергнуты рэзкай крытыцы творы Гутэрмана, Сталярчыка, Белагурскага, Эйдэльмана.

Трэба адзначыць, што аргбюро Саюза мастакоў па Беластоцкай вобласці мала праяўляла ініцыятывы ў арганізацыі для мастакоў лекцый ці гутарак, якія дапамаглі-б ім зразумець стыль соцыялістычнага рэалізма.

На сходзе мастакоў з радасцю падхоплен заклік аб арганізацыі творчага спаборніцтва ў падрыхтоўцы да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці», аб узяцці шэфства беластоцкімі мастакамі над мастакамі Брэста, аб пасылцы групы мастакоў (11 чалавек) на экскурсію ў Мінск, Ленінград і Маскву, аб арганізацыі ў Беластоку графічнай і скульптурнай майстэрняў і г. д.

Мастакі заходніх абласцей ахоплены адзіным жаданнем—новымі выдатнымі творамі сустрэць 23-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

І. РУБІНШТЭЙН,
старшыня Саюза совецкіх мастакоў БССР.

ВЫСПЯВАННЕ МУЖНАСЦІ

Аркадзь Куляшоў напісаў новыя вершы «Хлопцы апошняй вайны». Вершы гэтыя новыя не толькі па часу іх напісання, але і па фактычнай навізне раскрываючыхся ў іх якасцей. Якія-ж гэтыя якасці? Перш за ўсё велізарная значымасць тэмы. Пасля доўгага перыяда пісання «палегчаных» лірычных пейзажаў, насычаных значным паэтычным пачуццём, але залішне традыцыйных па тэме, па матэрыялу, па форме, Куляшоў звярнуўся да найбольш драматычных перажыванняў нашай рэчаіснасці і, у адпаведнасці з новым заданнем, занава перааформіў свой верш.

Тэма новых вершаў Куляшова — вайна. З усёй шматграннасці з'яў, якія складаюць агульную карціну вайны, Куляшоў вылучыў адно: трагічны лёс ашуканых салдат імперыялістычных армій, якіх «прыгналі страляць у маю краіну, у будучыню сваю». Паэт зварочваецца да «шчырых хлопцаў з Тэмзы і Сены», ашуканых буржуазнымі правіцелямі. Гэта гаворыць разумны, усхваляваны сучаснік, які дасканала разумее перавагу сваёй сацыялістычнай краіны над усімі краінамі свету, перавагу свайго лёсу над лёсам усіх яго далёкіх аднагодкаў. Ён глядзіць вачамі будучага на падзеі сучаснай вайны. Ён ведае, што надыходзіць бой, «ад якога лёс зямлі залежа» і ў гэтым баі пераможа сіла і розум сацыялізма — маладосці свету. І яму да болю шкада тых, хто гэтага не разумее. Вершы Куляшова так узвышаюцца над сярэднім узроўнем «ваенных» вершаў таму, што ў іх выражана жаданне зразумець сэнс сучаснай вайны, у іх ёсць пэўны пункт гледжання, які звязвае тэму вайны з тэмай будучага, у іх ёсць разумная сканцэнтраванасць на матэрыяле рэчаіснасці. Паказ жахаў вайны становіцца толькі зыходным пунктам для шырокіх паэтычных абагульненняў.

Вершы Куляшова «Хлопцы апошняй вайны», праклaміруючы адмаўленне паэта ад «лірычных спагад», на самай справе глыбока лірычныя.

Новыя вершы Куляшова зусім не адмаўляюць усяго таго, што раней пісаў паэт, але новыя вершы Куляшова стаяць значна вышэй цыкла «Юнацкі свет». Перш за ўсё таму, што ў іх выражана мысль аб найцяжэйшых выпрабаваннях, у якіх спее чалавечае шчасце. Новыя вершы Куляшова больш мужныя, больш суровыя. У гэтым іх асноўная вартасць.

Але не трэба думаць, што супрацьстаўленне суровай тэмы тэме ідылічнай у якойсьці меры аналагізіруецца з супрацьстаўленнем лірычнай паэзіі — паэзіі надіндывідуальнай. Такога роду супрацьстаўленне будзе ва ўсіх адносінах неправамерным. А што да новых вершаў Куляшова, дык яны па сутнасці сваёй не менш лірычныя, чым усё тое, што ў апошні час пісаў і друкаваў Куляшоў. Зусім бессэнсоўна ўстанаўляць якія-небудзь лірычныя штампы. Паэзія заўсёды лірычная, калі ў ёй ёсць непакой і асабістая ўсхваляванасць паэта. У «Хлопцах апошняй вайны» паэтычная ўсхваляванасць гучыць у кожным радку. Яна ў самым руху верша — праўдзівага, багатага вялікай колькасцю інтанацыйных пераходаў, максімальна прыбліжанага да добрай гутарковай мовы. Шмат каму, асабліва тым, хто выбраў сабе за паэтычны ўзор і нястомна капіруе інтанацыі, вобразы «Юнацкага свету» Куляшова, відаць, прыдзецца «перабудоўвацца на-хаду».

А сапраўднаму паэту нудна стаяць на месцы. Ён павінен нястомна рухацца, змяняць сваю манеру, шукаць кожны раз новыя довады паэтычнага ўздзейнічання. «Тое, што робіць паэт, заўсёды новая мадэль» (Луначарскі). Кожны верш павінен быць занава вынайдзен, як новы від самой паэзіі. Куляшоў разумее гэта. Выкарыстоўваючы мастацкія дасягненні сваіх папярэдніх вершаў (у першую чаргу «Крыўды»), Куляшоў стварыў «новую мадэль» — верш хвалюючага зместу і вялікай фармальнай навізны.

Г. БЯРОЗКІН.

Аркадзь Куляшоў

ХЛОПЦЫ АПОШНЯЙ ВАЙНЫ

Урывак

1.

Зноў сэрца маё сілай поўніцца,
Грудзі зайшліся ў жаданым клёкаце,
Нехта знаёмы, знаёмы здалёк ідзе:
Ці дожджыку кропля над завадзю
сіняй.
Ці звонкае вяселле на высокім покуце,
Ці шабельная ў мыльнай пене конніца
З людскімі галовамі на покаце...
Ці звон чмяліны над канюшынай.

Гэта вайна ў дзверы грукоча,
З Захаду спягамі чужымі калыша,
Лясамі дыша, лясы агнём ліжа...
Міма рачнога, вазёрнага плёса
Ідзе вайна, азіраецца скоса,
Трымаецца за сэрца сваё —
Папялішча...
Сваю смерць чуе, паміраць не хоча.

На бот генеральскі навёўшы глянец,
З пажарам страшэнным ідзе —
з юнацкай марай,
Паклаўшы яе, як у торбу, у ранец,
Па дарогам цягнучы невядомым.
Акопы ўяўляй — родным домам,
Дым — вечаровай хмарай,
Гарматы — вясновым громам,
Газы ўслаўляй — як туман лугавы,
Як белае воблака, пах калакалушы...
На прыемную гулянку выйшлі вы,
Юнацкія душы.
І плечы хлапцоў-юнакоў стружданы,
І гасне ў вачах кавалачак сінявы.

На звонкія заручыны
Едзеце сёння вы!..
І ў хаце і на выгане
пачастуюць вас,
І выганяць, і выганяць —
У добры час!..
І ногі пераб'юць (не калы, дык танкі),
І на пахмелле не дадуць ні кроплі.

Бачу: кульгаеце,
павярнуўшы аглоблі,
З тых заручын, з тае гулянкі.
А ў берагоў пытаюцца рэкі:
— Ці гэта хлопцы ідуць?
— Калекі.

Як вам давесці, што вас ашукалі
Пад дахам траншэй і ваенных палатак?
Як вы заробіце недужымі рукамі
На самае малае,
На пах аладак?..

З парахавога, далёкага дыму
Я вас па сумных вачах пазнаю;
Вас прыгналі страляць у маю
радзіму —
У будучыню сваю.
Укрываліся мы
не адным дахам,
Нас паілі рэкі не адны,
Калыхалі калыскі не адны...
Я з маленства іду шляхам
Жыцця,
а не вайны.

Я чуў,
каля рэк Беларусі
Ловячы ўзмах вільготных крыл,
Як адным вырасм звязалі гусі
І Дняпро, і Ніл.
Я слаў в важаком іх, з іх племем
дужым,
Насустрач смярчам пясчаным, бурам,
Блізкую песню і неграм, і індусам,
І, нават,
далёкім, далёкім бурам.

Шчырыя хлопцы,
З Тэмзы і Сены,
І адтуль, дзе плюскоча Райн,
Лепш да мяне ішлі-б...
Ёсць у мяне лугавое сена,
І зернем звініць камбайн,
І мёдам вее ад ліп.
З вамі на стане лугі пакашу.
Адпачываць з вамі буду ў цяні,
Дарогі ўсе пакажу
Вашае будучыні.

Павешу гамак між сукоў палявых,
Дзе вецер калісьці
Гойдаў калыскі
І зрэбныя торбы продкаў,
Закалышу як дзяцей сваіх,
Вас,
маіх аднагодкаў.
Мірна, нібы на пчаліны ўзятак,
Дождж прашуміць над сукамі.

. . . .

Як мне давесці, што вас ашукалі
Пад дахам траншэй
І ваенных палатак?
І ўся зброя мабілізована,
І ўсе шынелі,
І ўся хлусня.

. . . .

Цяжка ўздыхае з лясоў вайна,
Нехта на мове чужой кліча каня.

2.

Туды, дзе сталіся па зямлянках
Маркотных матак маркотныя дзеці,
У зялёных танках.
Мы з будучыні едзем.

На голых, спаленых дзялянках
Хвоі хістаюць задымленым веццем.

Едзем... едзем...
Ад руняў рускіх,
Ад бароў беларускіх
З гор грузінскіх,
З калін украінскіх.
За намі жыта, якому расці,
За намі дзікія качкі ў трысці,
За намі вазёры, на іх—лілеі.
За намі —
Ленін ў маўзалеі.

Едзем.
На тонкіх руках калін,
Асветленая сіняй фарай,
Ляжыць найвышэйшая з матч-хваін,
Што ўпала першай ахвярай.
Я кажу табе, неразумны салдат,
Хоць можа страляў ты ў яе па загаду.
Але з гэтых дат,
з гэтых дат
Я лірычную адкідаю спагаду.
Я знаю, цябе ашукалі, салдат,
Ды хвоі ўжо скошаны:
Во яны... во яны...
Мы лічым іх з гэтых маўклівых дат,
Як лічаць забітых воіны.
Табе хлусілі, што ў нас нестае
Жалеза,
каб біць жалеза,
Ты, нават, не знаеш, што бой настае,
Ад якога лёс зямлі залежа.
Табе манілі,
але нікому
Не лягчэй ад тае маны;
Зямля зайшлася ад дыму,
Ад грому,
Сярод белага дню туманы, туманы.

Лермантаў і Белінскі

Праблема ўзаемаадносін Лермантава і Белінскага і іх творчага ўзаемаўплыву яшчэ не распрацавана ў гісторыі рускай літаратуры. Вонкавыя факты біяграфіі не давалі матэрыялу для якіх-небудзь істотных вывадаў па гэтаму пытанню. Сустрэчы Лермантава з Белінскім мелі эпізадычны характар і пакінулі ў сучаснікаў уражанне аб іх глыбокай супрацьлегласці і чужасці адзін аднаму. Блізасць Лермантава да вышэйшых кругоў дваранскага грамадства, яго арыстакратызм, здавалася, былі непераадольнай гранню паміж ім і бедным плебеем-разначынцам.

Тым часам, існавала глыбокае ідэйнае падабенства гэтых пісьменнікаў. Паэзію Лермантава Белінскі лічыў найбольш поўным выражэннем эпохі, у ёй ён знаходзіў шмат уласцівага яму, Белінскаму, яго філасофскім сябрам, і ўсім мыслячым людзям 30-х гадоў. Дух адмаўлення, супярэчнасці паміж ідэаламі і жыццём—вось тое агульнае, на думку Белінскага, што зрабіла Лермантава цэнтральнай фігурай 30-х гадоў.

Лермантаў быў сынам эпохі, якую Герцэн характарызаваў як «царства змроку, свавольства, маўклівага заміраньня, пагібелі без знаку, пакут з хусткай у роце».

Лермантаў, як і яго перадавыя сучаснікі, рана адчуў трагедыю сваёй радзімы. Водгукі снежаньскага паўстання кранулiся яго, і, падобна Герцэну і Огарэву, якія юнакамі пакляліся на Вараб'ёвых гарах прысвяціць сваё жыццё служэнню народу, ён—яшчэ будучы дзіцём—выступае ў сваіх вершаваных і драматычных вопытах барацьбітом супроць тыранаў, задумваецца над лёсам свайго роднага народа і ўсяго чалавецтва.

Жывучы ў Тарханах, у маленстве, ён быў захоплен паэзіяй казачай вольнасці, яго хвалявала гістарычная барацьба рускага народа за сваю свабоду і незалежнасць, яго вабіў вобраз рускай сялянкі-паланяначкі, у татарскім рабстве захаваўшай сілу духу і любоў да радзімы. Вадзім Ноўгарадскі, традыцыйны вобраз у паэзіі дзекабрыстаў, быў яго любімым героем.

За 14 вёрст ад Тарханаў, у горадзе Чэмбары, у тыя-ж годы жыў сын павятовага лекара, тады яшчэ невядомы Лермантаву Вісарыён Грыгоравіч Белінскі. Тыя-ж уражанні жывілі і яго выабражэнне, гэтак-жа, як і Лермантаў, быў ён сведкай дзікасці павятовага памешчыцкага быта, свавольства і гвалту над сялянамі. Дзіцячыя ўражанні наклалі незабыўны след на свядомасці Лермантава і Белінскага. Пазней, яшчэ ў пачатку 30-х гадоў, абодва яны паступілі ў Маскоўскі універсітэт, назіранні над жыццём пензенскай правінцыі паслужылі матэрыялам для антыпрыгонных драм аднаго і другога, напісаных пад уплывам Шылера і якія выявілі здзіўляючае падабенства ў замысле, кампазіцыі, асноўнай ідэі, характарах герояў і ў дэталях. Гэтыя драмы—«Людзі і страсці», «Дзіўны чалавек» Лермантава і «Дзмітрый Калінін» Белінскага.

Як сцвярджае Венгераў, Лермантаў і Белінскі мелі агульны прататып для вобраза самадуркі-памешчыцы, гэтым прататыпам была нейкая Масолава, сваячка Лермантава.

У Маскоўскім універсітэце Лермантаў быў ідэйна блізкі да перадавой студэнцкай моладзі. Ён падзяляў яе захапленне Шылерам, Шэкспірам, ён жыва рэагіраваў на рэакцыйныя мерапрыемствы універсітэцкага начальства, быў салідарны з перадавым студэнцтвам у яго барацьбе з рэакцыйнай абстаноўкай універсітэта.

Лермантаў быў змагаром за чалавечае шчасце, за свабоду чалавечай індывідуальнасці, за поўнацэнную чалавечую асобу— прыгожую ў сваёй сапраўды чалавечай велічы. І ён не пераносіў гэтай барацьбы ў адцягненую сферу чалавечага духу. Яго барацьба служыла выражэннем імкненняў рускага народа да свабоды і асветы, выражэннем пратэсту супроць рабства і ланцугоў, супроць прыніжэння чалавечай вартасці ў прыгонніцкай Расіі.

Вызваленне Белінскага ў пачатку 40-х гадоў ад путаў рамантычнага ідэалізма зблізіла яго з Лермантавым. Паэзія Лермантава супадае з настроем Белінскага. Супярэчнасці Лермантава адчуваюцца ім як уласныя супярэчнасці, пакуты паэта—як свае асабістыя пакуты. Перад паэзіяй Лермантава ў перыядзе 1840—1841 г. г. адступаюць на задні план іншыя літаратурныя інтарэсы Белінскага. Пісьмы яго да сяброў перасыпаны цытатамі з Лермантава, і вобразы Лермантава міжвольна маюць уплыў на стыль яго пісьмаў і артыкулаў. Як вар'ят, па ўласнаму выразу, цвярдзіць ён «И скучно и грустно» Лермантава і яго «Думу».

У пісьме да Боткіна Белінскі піша:

«Памерці вельмі не хочацца — жыццё ніколі так не вабіла, а жыць страшна... Грудзі змучаны — у іх няма месца жывога... А мне хацелася-б хоць на імгненне памерці ад збытку жыцця».

Досыць прыгадаць наступныя радкі з верша Лермантава «11 июля 1831 г.», каб выявіць агульнасць яго настрояў з настроем пісьмаў Белінскага:

Есть сумерки души, когда предмет
Желаний мрачен; усыпленье дум,
Меж радостью и горем полусвет;
Душа сама собою стеснена;
Жизнь ненавистна, но и смерть
страшна.
Находишь корень мук в себе самом.

Бурны духоўны рост Белінскага, яго рэзкія пераходы ў пошуках ісціны ад адной філасофскай сістэмы да другой, яго разрывы з сябрамі на глебе ідэйных шуканняў, яго пераход да адмаўлення ўсіх дасягнутых ісцін, і яго залежнасць ад іх, мелі свой адбітак на характарыстыцы ім Пячорына:

«Ён шмат адчуў, шмат любіў, і па вопыту ведае, як надоўгавечны ўсе пачуцці, усе прывязанасці; ён шмат думаў аб жыцці, і па вопыту ведае, як ненадзейны ўсе заключэнні і вывады для тых, хто прама і смела глядзіць на ісціну, не цешыць і не ашуквае сябе пераконаннямі, якім ужо сам не верыць. Дух яго паспеў для новых пачуццяў і новых дум, сэрца патрабуе новай прывязанасці: **рэчаіснасць** — вось сутнасць і характар усяго гэтага новага. Ён гатовы для яго, але лёс яшчэ не дае яму новых вопытаў, і пагарджаючы старымі, ён усё-ж такі па іх мяркуе аб жыцці. Адсюль гэта бязвер'е ў сапраўднасць пачуцця і мыслі, гэта ахладжэнне да жыцця, у якім ён бачыць то аптычны зман, то бяссэнсавае мільганне кітайскіх ценяў. Гэта пераходнае становішча духу, у якім для чалавека ўсё старое разбурана, а новага яшчэ няма, і ў якім чалавек ёсць толькі магчымасць чагосьці сапраўднага ў будучым і поўная здань у сучасным».

Збліжаючы змрочнае становішча Пячорына з пераходным становішчам свайго духу, Белінскі ў агульным аптымістычным ўспрымае яго вобраз:

«Душа Пячорына не камяністая глеба, але засохлая ад спёкі гарачага жыцця зямля: няхай узрыхляць яе пакуты і арасіць багаты дождж, —і яна вырасціць з сябе пышныя, раскошныя кветкі нябеснай любві... Яго ў многіх адносінах дрэннае сучаснае абяцае прыгожае будучае».

Белінскі, такім чынам, звязаў з Пячорыным надзеі на лепшае будучае рускага грамадства. Ён перанёс на Пячорына надзеі на сваё асабістае адраджэнне з бездані адчаю і няверʼя.

Пячорын захапляў яго мяцежнымі парываннямі свайго духу, сваёй непрымірымасцю да спакою і ўтульнасці філісцёрскага жыцця, трагедыю Пячорына ён бачыў у супярэчнасці паміж гарачымі парываннямі яго духу і вонкавай рэчаіснасцю, якая не давала яму выйсця. «Жыццё ёсць дзейнічанне, а дзейнічанне ёсць барацьба», — сказаў Белінскі яшчэ ў «Літаратурных марах». Ва унісон гучаць лермантаўскія словы:

Так жизнь скучна, когда боренья нет.
Мне нужно действовать.
Я каждый день бессмертным сделать
бы желал.
Покоя, мира и забвенья не надо мне.

Чым большую вайстрыню набывала адмаўленне Белінскім «гнуснай расійскай рэчаіснасці», чым вышэй уздымалася хваля пратэсту супроць яе ў яго творчасці, тым бліжэй станавіўся яму Лермантаў. «Дэман» у 1841—1842 гг. стаў для яго крыніцай мудрасці, паэзіі, прыгажосці. Ён сам перапісвае паэму, распаўсюджвае, чытае сваім знаёмым. У «Дэмане» яго вабіць «с небом гордая вражда», барацьба за перамогу пазнання і свабоды.

У 1840 годзе, на глебе ідэйнай блізасці, дасягаецца і асабістае збліжэнне паміж Лермантавым і Белінскім, якое, праўда, выразілася толькі ў адным спатканні ў часе арышта Лермантава за дуэль з Барантам, калі Белінскі наведаў яго.

Пісьмо Белінскага да Боткіна ад 16 красавіка 1840 года перадае тое выключнае захапленне, якое адчуў Белінскі ад ненасрэднага знаёмства з Лермантавым: «Д'явальскі талент!», «Глыбокі і магутны дух!»

«Мне радасна было бачыць у яго разважлівым, ахалоджаным і азлабленым поглядзе на жыццё і людзей семя глыбокай веры ў вартасці таго і другога. Я гэта сказаў яму — ён усміхнуўся і сказаў: «дай бог».

Паэзію Лермантава Белінскі ўспрымаў як лячэбную крыніцу, якая лечыць душэўныя раны чалавека. Вершы жывога жыцця, магутны гук пратэста, што заглушаў матывы адчаю, — вызначалі для Белінскага сутнасць яго творчасці. Праніключыся жыватворчымі сіламі лермантаўскай паэзіі, Белінскі смела ішоў на барацьбу з грознай для яго рэчаіснасцю, перамагаючы скептыцызм і адчай. Паэзія Лермантава дапамагла яму ўзняцца на новую, вышэйшую ступень у сваім ідэйным развіцці.

З другога боку, крытыка Белінскага, якая змагалася за рэалістычнае мастацтва, дапамагала Лермантаву глыбей пранікаць у тайны мастацкай творчасці. Пад уплывам Белінскага у ім мацнела мысль аб неабходнасці зрабіць мастацкую творчасць асноўным зместам свайго жыцця, — не толькі духоўным, але і прафесіянальным. Знамянальны факт увагі Лермантава да «Отечественных записок», дзе працаваў Белінскі, яго дружба з Краеўскім і, як сцвярджаюць сучаснікі, мысль аб выданні журнала, якая з'явілася ў яго ў часе другой ссылкі на Каўказ. Ранняя смерць перашкодзіла ажыццяўленню гэтых планаў Лермантава і развіццю дружбы паміж ім і Белінскім.

Д. САВАНОВІЧ.

Значна ўзбагаціўся кніжны фонд Баранавіцкай бібліятэкі, узрос да 6 тысяч лік абанентаў яе.

На здымку: у рускім аддзеле Баранавіцкай бібліятэкі.

Фота Е. Халдзея (Фотахроніка БЕЛТА).

Р. МУРАШКА

КАЗКА-ПРАЎДА

Гармонія дабра-хараства як гармонія жыцця.

Ці можа існаваць такая гармонія ў жыцці, у сусвеце?

Такое пытанне ўзрушае чытача, калі ён чытае і перачытвае «Казкі жыцця» Якуба Коласа.

Крытыкі, якія даўно сышлі са сцэны, гаворачы пра гэтую кніжку пісьменніка, абмяжоўваліся толькі тым, што казалі: «Казкі жыцця» Якуба Коласа—гэта алегарычна-сымбалістычныя апавяданні». І ўсё. Разуменне імі гэтых твораў далей не магло ці не хацела ісці. Ёсць усе падставы думаць, што не хацела. Тым больш, нашы сучасныя крытыкі павінны былі заўважыць гэтую акалічнасць і зрабіць адпаведныя вывады. Нажаль, гэтага не зроблена А тым часам «Казкі жыцця» з'яўляюцца цэнтральнай кнігай сярод усіх твораў Якуба Коласа.

Шмат якія крытыкі адзначалі, што лірычнасць твораў Якуба Коласа глыбокая, эмацыянальная; шмат якія сцвярджалі, што Якуб Колас — вялікі знаўца чалавечае псіхалогіі; і ўсе сыходзіліся на тым, што малюе ён шырокія карціны жыцця народа. Усё гэта цалкам адпавядае сапраўднасці. Лірыка яго ціхая і задуменная, як шэпты лесу, дзе яму давялося пражыць свае дзіцячыя годы, вабная, як залацістая летняя раніца і часам загадкава-смутнаватая, як «сіняй смугой» засланая даль. Ён бясспрэчна вялікі знаўца чалавечае душы, досыць прыгадаць яго апавяданні і яго аповесці, у якіх, бадай, ніводзін рух чалавека не астаўся не асветлены ім з сярэдзіны.

«Сымон Музыка» і «Новая зямля» — эпічныя карціны жыцця цэлага народа, мова якога ёсць мова пісьменніка і якому мова пісьменніка з'яўляецца роднаю моваю. Абодва гэтыя творы па сваёй значнасці для беларускага народа і па сваёй літаратурнай вартасці і манументальнасці заслугоўваюць стаяць побач з «Гайаватай» Лонгфело і Калевалай. І, аднак, усе крытыкі абыходзілі старанна адну асаблівасць творчасці пісьменніка, адзін бок яго твораў — насычанасць глыбокім сэнсам, простымі, і вялікімі адначасна, і глыбокімі думкамі аб жыцці.

Яго думкі аб жыцці — плод не толькі ўдумлівага наглядання і вывучэння жыцця свайго народа, гэта больш за ўсё будзе плод сваяцтва душ, плод зліцця душ. І таму простая мудрасць народа не з'яўляецца нейкаю староннюю пісьменніку, суседскаю, не, яна—арганічны элемент яго творчасці, бо яна арганічная неадлучнасць яго душы, у якой адлюстравалася душа яго народа. Дыханне яе падслухаў Якуб Колас, растваpаючыся ў прыродзе роднага краю, мудрасць народа ён піў прагна, слухаючы яго казкі і яго песні. У яго творчым характары ўдала спалучаецца глыбокая эмацыянальнасць з філасофскім спакоем і мудрасцю. Як ніхто з беларускіх пісьменнікаў, ён ведае і адчувае прыроду, — я хачу гэтым сказаць больш, я хачу сказаць, што ён бачыць і ўсім нутром сваім адчувае душу прыроды.

Жыхары яго прыроды жывуць і думаюць, як жывуць і думаюць людзі, і часам у вобразе шэршня, бярозкі або каменя мы пазнаём сваіх блізкіх і нават вельмі блізкіх знаёмых. І тымчасам паводзіны і вонкавыя рухі іх не выходзяць за межы паводзін іх носьбітаў. Колас бышцам падкрэслівае, што нямыя стварэнні, хоць і не разумеюць мовы чалавека, але жывуць пэўным жыццём, якое часта вельмі падобна да жыцця людзей.

У яго казках знайшлі свой адбітак усе найважнейшыя гістарычныя падзеі ад часоў першай рэвалюцыі і да часоў, бадай, калектывізацыі. І ўжо гэта адна акалічнасць, — што пісьменнік сабраў у адзін зборнік творы аднаго жанра, напісаныя на працягу дваццаці год, — прымушала задумацца крытыкаў над тым, якая-ж ідэя кіравала пісьменнікам пры гэтым? Ёсць усе падставы думаць, што пісьменнік зрабіў так не выпадкова, што ён сабраў наўмысля такія творы з тым, каб паказаць яго адносіны да жыцця, падкрэсліць свае цесныя сыноўныя адносіны да народа і раскрыць душу народа.

Пачынаючы з казкі «Жывая вада» і канчаючы казкаю «На ўсё ёсць прычына», у абстаноўцы, бадай, заўсёды ці прыгожа-радаснага ці прыгожа-смутнага пейзажа пісьменнік прымушае сваіх герояў гаварыць у чалавечай мове ісціны жыцця — ці горкія, ці бадзёрыя і абнадзейваючыя. І заўсёды пры гэтым сам пісьменнік застаецца спакойны, па-філасофскаму глядзячы на малюнак жыцця, які разгарнуўся перад ім, — не мітусіцца, не радуецца, не горніцца — ён толькі канстатуе жыццёвы факт.

Ён задумваецца над лёсам мовы народа і прыходзіць да думкі, што права гаварыць на сваёй роднай мове не можа адабраць ніхто апроч прыроды, г. зн. права гэтае можа знікнуць толькі са смерцю ўсяго народа («Дудар»). І далей усе казкі ў розных сюжэтах, у розных сітуацыях прасякнуты глыбокімі філасофскімі думкамі, якія падкрэсліваюць гэтую асноўную думку.

Адзінокае дрэва ўбачыла, што ўсе сябры пакінулі яго, і моцна зажурыўшыся, пытае:

— Што рабіць?

— Пусціць глыбей карані ў зямлю, — сказаў крумкач, мудрая галава, летучы на раздабыткі» («Адзінокае дрэва»).

«...Не воля аднаго, а воля ўсіх толькі і можа мець сілу і права», канстатуе ён проста ў казцы «Процеў вады».

Спрачкам аб вінавайцах імперыялістычнай вайны ён прысвячае два творы «Асінае гняздо» і «Стары лес». Першы напісан у 1913 годзе, а другі ў 1917 годзе. Першы канчаецца такімі словамі: «...згінуць восы і шэршні, спакайней будзе на свеце», а другі — такімі:

«І нашто была нам гэтая трасяніна? — казала рэшта пушчы: — ці нам не хапіла-б месца пад ясным сонейкам? Дзе наша сіла? Дзе краса наша?

— Каб не гэта рэчка (граніца — **Р. М.**), каб яна не падзяляла нас на дзве часткі, то гэтага не здарылася-б, — казалі хвоі.

— Праўда, праўда, — падхапіла ліпа: — з-за яе знішчылася пушча.

— Ну, і ўцешцеся, калі знайшлі вінаватага! — адказала сярдзітая сойка».

Іншы раз думкі выказваюцца ім у форме пастаноўкі запытання, як у казцы «Што лепей».

— Эх, якая сляпая была я, — казала Хвоя, — не ведала я цаны жыцця, а пазнала яе тады, калі смерць ужо кінула цень на мае галінкі.

— А як табе здаецца. Хвоя, — спытаў вецер: — што лепей: пражыць свой век ціха, спакойна, не пазнаўшы, як міла жыццё, ці пазнаць яго хараство і вартасць цаной вялікага няшчасця?».

І ў наступным творы «Чыя праўда» аўтар працягвае думку далей і дае адказ на гэтае запытанне:

«— Лепш быць няшчасным, але відушчым, чымся шчаслівым ды сляпым, — адказаў дуб».

Толькі ў адным выпадку сум авеяў сэрца пісьменніка і ён у ціхім смутку задумаўся на момант. Гэта ў «Крыніцы», калі гара прадракае кроплям-слёзам непаслухмянае свае дачкі-крыніцы вечнае бадзянне па свеце.

«Прыгрэла сонейка, заззялі кропелькі дарагімі каменнямі і зніклі.

Куды-ж яны дзеліся? Куды?»

Ён падкрэслівае мудрасць працоўнага народа, усхваляючы радасць працы, радасць будаўніцтва самім народам свае культуры. Так, у казцы «Што яны страцілі» стары дуб — у ролі разумнага дзядзькі, і мы сабе ўяўляем гэткага дзядзьку ў вобразе чалавека.

«А дуб, хоць ён у школу вучыцца не хадзіў, і педагогікі не праходзіў, але быў добры педагог. Ён сказаў:

— Толькі тая веда робіцца нашым сталым здабыткам, якая здабываецца намі самімі».

Як глыбокі знаўца чалавечае душы, ён гаворыць:

«У глыбі, дзесь у нутрах гэтай глыбі, ёсць нікому нявідныя скрыжалі, а на гэтых скрыжалях запісаны мукі і боль, аб якіх часам ніхто не ведае і не дагадваецца («Кучаравае дрэва»).

Аднак, ён не пакідае гэтага моманта ў яго статычны, думка яго тчэцца і тчэцца ў прыгожыя і заўсёды бадзёрыя ўзоры.

«І толькі той пойме як цяжка было гэтаму Каліву ў лузе, хто сам многа гараваў, многа меў у сэрцы горкіх дум, якімі не з кім было падзяліцца» («На чужым грунце»).

«І хто ведае: быць можа, чым часцей давецваюцца да нас нягоды, тым глыбей пачуванне цаны жыцця, тым ясней яго светлыя моманты» («Камень»).

У процілегласць ідэалістычнаму мысленню,- ён не дзеліць увесь свет на дзве часткі: зло і дабро, а, як матэрыяліст, угледаецца глыбока ў з'явы жыцця. Так, у «Зло — не заўсёды зло» выказана зусім пэўная і выразная думка, што калі аднаму гэта можа быць злом, дык другому яно служыць дабром, крыніцаю жыцця.

Як выдатны псіхолаг, заўважае ён на адну асаблівасць чалавечае натуры, на схільнасць душы імкнуцца да ўсяго прыгожага і бачыць усё прыгожае толькі ў далечыні. Ён не можа мірыцца з гэтым і таму «даль» развенчваецца ў яго ў цэлым шэрагу казак: і ў «Хмарцы», і ў «Балотным агні», і ў «Далі», і ў «Што лепей», і ў «На ўсё ёсць прычына». І ва ўсіх выпадках ён бязлітасна выкрывае зманную прыгажосць далі і вучыць: прыгажосць вакол вас, шукайце яе.

Цяпер мы падыходзім да апошняга, што пастаўлена ў самым пачатку запытаннем: ці можа існаваць гармонія дабра-хараства як гармонія жыцця?

Колас на гэта адказвае пэўна. Самой формай сваіх казак, у якіх за дрэвам, за птушкаю бачыш чалавека, а за чалавекам адчуваеш прыроду, ён гаворыць аб прыроджанай гарманічнай суладнасці жыцця сусвету і жыцця на зямлі. Але, як матэрыяліст, ён разумее гэта як гармонію канфліктаў і супярэчнасцей, як адзінства процілегласцей. Ён бышцам робіць выразны намёк на гэта ў казцы «Процеў вады». Ён гаворыць, што вада не можа стаяць, што стаячая вада заводзіць смурод і распад, вынікам чаго неўнікнёна пагібель, катастрофа. Такім чынам, у руху бачыць ён гучанне жыцця, у гармоніі канфліктаў і супярэчнасцей, у адзінстве процілегласцей. І ўсімі сваімі казкамі падкрэслівае, што нязменны сусветныя канфлікты, нязменны канфлікты, закладзеныя ў прыродзе, што яны могуць час ад часу мяняць свой выгляд у наступовым і безупынным развіцці—руху — шорханні, але змяніцца і ператварыцца ў нейкую іншую гарманічную сістэму не могуць. І, каб не пакінуць ніякае двусэнсоўнасці, пісьменнік у самай апошняй, заключнай казцы «На ўсё ёсць прычына» гаворыць зусім проста так:

«Але кожная з'ява і кожная рэч на свеце знаходзіцца пад уплывам розных чыннікаў, і чыннікі гэтыя часта зусім процілежных катэгорый. І бывае такі момант, калі сілы чыннікаў розных уплываў стыкаюцца, як у полі крыжавыя дарогі, перасякаюцца ў якім-небудзь месцы, каб падпарадкаваць сабе гэтую з'яву ці гэтую рэч, каб ужо панесці яе па сваёй пуціне».

Вось і канчаюцца мае думкі пра цудоўную казку-праўду, створаную прыгожай выдумкай вялікага мастака-мысліўцы Якуба Коласа. А што гэтыя казкі з'яўляюцца праўдай, як ніякія ў свеце іншыя казкі, зноў-такі сам аўтар неаднаразова сцвярджае.

«Калі вы скажаце, што гэта не праўда, а байка, то я запытаюся: а дзе тая мяжа, што аддзяляе праўду ад выдумкі? І ці не бывае так, што выдумка ходзіць, як праўда, а чыстую праўду лічаць за выдумку?» («Што яны страцілі»).

І гэта не звычайны літаратурны прыём, а сэнсавы напамінак чытачу, як трэба чытаць і разумець яго казкі.

Пра гэта сведчыць і асаблівасць мовы яго герояў, якіх адразу пазнаеш па іх гутарцы, выразна індывідуалізаванай,— ці гэта гаворыць шэршань, ці гэта шалахціць ліпа, ці гэта сумуе бярозка, ці звініць камар, што яшчэ раз падкрэслівае, як глыбока ведае і адчувае Колас жыццё прыроды.

Паэтычнасць, вобразнасць яго казак дазваляе чытаць іх як найпрыгожыя лірычныя вершы, гэтулькі ў іх пачуцця і хараства.

Але паэтыка гэтых твораў Коласа чакае яшчэ свайго даследчыка і аб ёй трэба гаварыць асобна і трэба гаварыць поўна.

Гэта не крытычны артыкул і аўтар просіць не лічыць яго за гэтакі, гэта проста рад думак, якія выніклі пры неаднаразовым перачытванні «Казак жыцця» — выдатнае схованкі дыяментаў мудрасці нашага народа.

Работнікі мастацтваў БССР, указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 20 чэрвеня 1940 года ўзнагароджаныя ордэнамі і медалямі Саюза ССР. Злева направа — верхні рад: узнагароджаны ордэнам **«Знак Почета»** М. М. Моін, узнагароджаныя медаллю **«За трудовое отличие»:** А. А. Бельскі, Л. А. Ермоліна, М. Н. Кананенка, Б. К. Будраўцаў, І. В. Лапацін, В. Г. Назараў; ніжні рад: М. З. Арлоў, Е. А. Падзельская, Г. М. Рубенчык, J. І. Счэснсовіч, В. І. Таланкін, Г. А. Шчолкіна, Ю. В. Хіраска.

Фота І. Каплінскага

Тэатральны калектыў чыгуначнікаў

Чалавек у форме чыгуначніка вядзе размову па тэлефону. У голасе яго нецярплівасць:

— Таварыш Канановіč, што ты там бавішся, цябе-ж мы ўсе тут чакаем. Сабраліся даўно, ідзі хутчэй... Так, чакаем...

На мяккіх крэслах, на канапах сядзяць маладыя і пажылых год мужчыны і жанчыны. Яны ўсе пільна глядзяць на ударлівага інжынера службы сувязі Эдуарда Ракіту, які вядзе размову па тэлефону з тэхнікам-канструктарам П. І. Канановіčам,—той сёння чагосьці затрымаўся і не паспеў прыйсці ў вызначаны час. Рэжысёр спектакля Аляксандр Рыбальчанка трымае ў руках нумар «Полымя Рэвалюцыі», адгорнуты на тым месцы, дзе надрукавана п'еса пісьменніка-ордэнаносца нябожчыка Эдуарда Самуйлёнка «Пагібель воўка». Нехта шэптам каторы ўжо раз паўтарае сваю ролю. Зайшоў акурат у пакой клуба смуглы, каранасты чалавек. І ўсе з ім прывіталіся.

— Добры дзень, Сяргей Іванавіч.

— Дзень добры,—адказаў ён, і адразу-ж:—Чаму дагэтуль не пачалі рэпетыцыі?

— Вы разумееце, Сяргей Іванавіч, Канановіč затрымаўся на заводзе, — гаворыць інжынер Ракіта.

— Гэта нікуды не варта,—рэзюміруе тав. Агранянц,—мастацкі кіраўнік і пастаноўшчык спектакля «Пагібель воўка».—Калі мы гэтак будзем працаваць, нічога не выйдзе. Дэкада зусім ужо блізка, а мы яшчэ багата чаго не зрабілі. Быў я зараз у палітаддзеле чыгункі. Там сказалі: спектакль павінен быць такім, каб Лазар Майсеевіч сказаў «выдатна».

Тым часам надышоў Канановіč—старэйшы удзельнік драматычнага гуртка. Яго трохі прабралі за спазненне, хоць ён і не вінен быў: работа пільная на заводзе.

У глыбіні сцэны высіцца велізарная, свежа выгабляваная арка, а недзе воддаль, на гарызонце, хацінкі. Крадучыся, з яубальтоўкай за плячыма, нібы сапраўдны лясны воўк, ступае па сцэне малады чыгуначнік Прудпікаў. І ўжо адразу не цяжка дагадацца, што гэта і ёсць заядлы воўк у чалавечым грамадстве — Харкевіч. Лёгкай ступой, нібы гуляючы і захапляючыся сваім кожным рухам, ходзіць па пакою гуртковец Якель. Ён нервова кідаецца да тых месц, дзе павінны стаяць тэлефоны, і ў знямозе падае, калі даведваецца пра пагібель Харкевічаў і ім падобных.

На сцэну, як вецер, улятае С. Долгіна—выканальніца ролі Сцепаніды. Яна гаспадарскім вокам аглядае сваю ўмоўную гаспадарку. Вельмі-ж ёй шкада, што індыкоў без яе дазволу пад нож хочуць пусціць, і яна накідваецца на Данілу—Ракіту. І ўжо нячутна гучыць камертон, і пачынаецца песня. Захлынаецца галасісты баян...

З глыбіні сцэны Сяргей Іванавіч сочыць за кожным рухам, за кожным выканаўцам, часам робіць заўвагі.

Так нараджаўся спектакль «Пагібель воўка» у драматычным калектыве Гомельскага клуба чыгуначнікаў імя Леніна. Гэта не прафесіянальны тэатральны калектыў, а самадзейны. Але ён бадай што не ўступіць некаторым прафесіянальным. У яго рэпертуары ёсць «Слава» В. Гусева, «Любоў Яравая» К. Трэнёва, і, побач з гэтымі сучаснымі творамі,—камедыя класіка сусветнай драматургіі, іспанскага камедыёграфа Лопе дэ Вега «Сабака на сене». У гэтага калектыва ёсць свае пэўныя традыцыі, ёсць выканаўцы, якія не на жарт, а сур'ёзна і стала працуюць у галіне тэатральнага мастацтва: даволі сказаць, што тэхнік-канструктар завода Гомсельмаш тав. Канановіč вось ужо дзесяць год як звязан з тэатральным калектывам. Ён выканаў некалькі дзесяткаў рознастайных ролей, стварыў вобразы, якім глядач апладыраваў і якімі захапляўся. У сваёй рабоце над вобразам разумнага, чалавечнага ў поўным сэнсе слова Мірона Бокуця Канановіč знайшоў і выявіў цеплыню, надзвычайную пачуццёвасць, чалавечую мудрасць, якой шчодра надарыў вобраз таленавіты драматург.

Якель, Іваніцкі, Іотка, Пакроўская — гэта людзі, якія прайшлі годы разам з драмкалектывам, і якія, гэтак-жа як і Канановіč, любяць свой тэатр, жывуць ім якім дораг кожны поспех тэатра і крыўдна кожная, хоць маленькая няўдача яго.

У драматычнага калектыва клуба за плячыма не толькі вялікі стаж існавання, але і гастрольныя паездкі па станцыях чыгункі, у Маскву, Мінск, на алімпіяды і агляды. У леташнім годзе на сцэне Маскоўскай транспартнай акадэміі драмкалектыў ставіў камедыю «Сабака на сене». І студэнты, будучыя камандзіры соцыялістычнага чыгуначнага транспарта, горача апладыравалі сваім сабратам—камандзірам і радавым чыгуначнікам, выступаючым перад імі ў якасці актораў.

Асабліва вялікай творчай радасцю для калектыва былі дні дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, калі ён з падмосткаў тэатра імя Станіслаўскага паказаў маскоўскаму гледачу народна-гераічнае прадстаўленне «Пагібель воўка», у якім было занята 180 чалавек, і ў якім арганічна былі пераплецены драматычнае майстэрства з хорэаграфічным і вакальным. Новую радасць перажыў калектыў, калі адзін з яго удзельнікаў, рэжысёр і актор, А. Рыбальчанка быў узнагароджан медалю «За трудовое отличие».

Зараз калектыў, акрылены поспехамі, бярэцца за яшчэ больш складаныя работы, ідзе да далейшага ўдасканалення свайго майстэрства. І мы яму пажадаем плённай работы на карысць соцыялістычнага мастацтва, якое штодзённа ўзбагачаецца натхнёнай творчасцю народа.

Рам. САБАЛЕНКА.

ДРАМГУРТОК ШКЛОЗАВОДА

Польскі драмгурток шклозавода — адзін са старэйшых у Беластоку самадзейных калектываў. Ён арганізаваўся ў студзені мінулага года, калі вызвалены з-пад панскай улады малады совецкі горад яшчэ толькі адбудоўваў сваю гаспадарку.

У студзеньскую сцюжу ў неапальваемым памяшканні штовечар збіраліся маладыя энтузіясты з тым, каб арганізаваць культурны адпачынак рабочым свайго завода. Самі рабочыя — майстры-шкloдувы, банячнікі, мукаўшчыкі, адносчыцы, — працуючы на розных зменах, яны даражылі кожнай вольнай хвілінай. Збіраліся ў заводскую сартыровачную, прыходзіў кіраўнік гуртка—рэжысёр Дома народнай творчасці Сегаловіч. Да першай абласной алімпіяды гурткоўцы рашылі падрыхтаваць п'есу «Узнятая цаліна». Задача нялёгкая. Колькі сілы, энергіі і стараннасці прыйшлося прыкласці, каб апраўдаць сваю смелую ініцыятыву — стварыць першы спектакль. І любоў да справы, старраннасць перамаглі. Самі гурткоўцы не чакалі такога бліскучага выніку. На абласной алімпіядзе драмгурток шклозавода заняў першае месца, атрымаў прэмію. Перамога выклікала творчы ўздым не толькі ў гуртку, але і на вытворчасці. Руплівасць і старраннасць вызначаюць гурткоўцаў і на рабоце. Большасць з іх перавыконваюць нормы, з'яўляюцца стаханаўцамі.

Зайдзіце ў час любой змены на завод, і вам пакажуць гурткоўцаў, пахваляць за работу. Вось стаханаўцы-шклодувы Іосіф Кравец, Дамінік Пракоп, які выконваў ва «Узнятай цаліне» ролю Давыдава, Іосіф Дэмскі, Антон Міц, Вітольд Селевіч, Ян Валендзюк, адносчыцы Марыя Кшэмінская, Ванда Місюна, мукаўшчыцы Елена Місюна, Чэслава Грамбург, начальнік змены Раман Возняк, старшыня заўкома Станіслаў Лапот.

Гурткоўцы любяць свой завод, свой калектыў. Улучыўшы вольную часіну, яны спяшаюцца ў клуб, абсталяваны з заводскай сартыровачнай. Цяпер у драмгуртку рыхтуюць пастаноўку «Васса Железнова», аднаактную п'есу І. Гурскага «На варце» і канцэртную праграму. Гурткоўцы развучваюць новыя ролі, увесь вольны час аддаюць гуртку, каб першую гадавіну вызвалення ад польскіх паноў адзначыць новымі спектаклямі, новым выступленнем у сваім клубе, для сваіх рабочых.

В. ЦІМСКІ.

гор. Беласток.

ГЕНІЯЛЬНЫ МАЙСТАР СЦЭНЫ

Два годы мінула з дня смерці К. С. Станіслаўскага. Здаецца, што гэта было толькі ўчора: траурныя мелодыі Шопена і Бетховена, бясконцая чарга людзей, якія прышлі на апошняе развітанне...

Але дарэмна памяць імкнецца вярнуць гэтыя сумныя ўспаміны. Яны адразу-ж губляюцца ў мыслях аб жывым Станіслаўскім, яго справах і творчасці. Імя яго паўтараецца і будзе паўтарацца так часта, у такой арганічнай сувязі з сучаснасцю, што здаецца — у Маскве, у ціхім Леонцьеўскім завулку, у старым двухпавярховым асабняку, прадаўжае яшчэ біцца яго гарачае сэрца, прадаўжае нястомна працаваць мозг мастака і мысліцеля.

Выходзяць яго кнігі, выклікаючы жывейшую цікавасць сусветнай грамадскасці, у газетах паяўляюцца яго новыя артыкулы, раней не апублікаваныя, — такія актуальныя і патрэбныя, як быццам ён пісаў іх ноччу перад выхадам газеты. (Напрыклад, аб творчай дысцыпліне ў апошнім нумары газеты «Советское искусство»). У лепшым у свеце драматычным тэатры, створаным ім разам з Неміровічам-Данчэнка, у оперным тэатры яго імя, у маладзёжнай опернай студыі — прадаўжаюць ісці спектаклі ў пастаноўцы яго і яго вучняў, прадаўжаюць іграць акторы, ім выхаваныя. У сотнях тэатраў тысячы актораў, рэжысёраў звяртаюцца да яго кніг за парадамі ў мінуты творчых пошукаў, затрудненняў. У дзесятках тэатральных навучальных устаноў моладзь, змена старой акторскай гвардыі, будучае совецкага тэатра, вучыцца майстэрству па сістэме выхавання актора, створанай ім.

Станіслаўскі — гэта эпоха ў гісторыі рускага тэатра.

Малады Маскоўскі мастацкі агульна даступны тэатр, створаны Станіслаўскім і Неміровічам-Данчэнка ў 1898 годзе з аматараў і вучняў філарманічнага вучылішча, стаў перадавым тэатрам, тэатрам нястомных творчых шуканняў, тэатрам, які адкрыў драматургічныя таленты Чэхава і Горкага, тэатрам, які выхаваў вялікіх актораў рускай сцэны.

Адмаўляючы руціну і штамп старога тэатра (глядзі, напрыклад, яго артыкул «Аб рамястве»), Станіслаўскі прагна схопліваў усё лепшае, што было ў тым-жа Малым тэатры, у майстэрстве яго артыстаў, у яго слаўных шчэпкінскіх традыцыях. Незабыўнае ўражанне зрабілі на яго творчыя сустрэчы з Федотавай, Ермолавай, Ленскім. Смела можна сцвярджаць, што школа Станіслаўскага ёсць прадоўжаная і развітая рэалістычная школа Шчэпкіна. Шчэпкінскае: «свяшчэнадзейнічай ці прэч з тэатра» — было для Станіслаўскага асновай жыцця. Ён ладпарадкаваў яму сваё жыццё, жыццё створанага ім тэатра, ён патрабаваў гэтага ад кожнага мастака.

Тэатр вялікай рэалістычнай праўды, тэатр смелых дзярзанняў, тэатр без канонаў і руціны, тэатр, які ідзе ў нагу з жыццём, — вось аб чым марыў Станіслаўскі, вось да чаго рваліся сэрца і думы вялікага мастака.

Адсюль яго любоў да вырашчвання маладых тэатральных арганізмаў, адсюль яго патрабаванні да сваіх вучняў — сцеражыцеся творчага самазаспакаення і самаздаволенай мясцічасці, у іх смерць мастацтва.

Станіслаўскі разумеў і нястомна сцвярджаў, што творчае натхненне мастака павінна падрыхтоўвацца ўпартай работай над роллю, творчымі пошукамі. Уменне прыводзіць сябе ў творчае становішча даецца толькі пасля ўпартай працы! Актор павінен навучыцца чэрпаць назіранні з акружаючай рэчаіснасці, навучыцца заўважаць у жыцці характэрныя і тыповыя з'явы.

Не дылетант, а дасканала валодаючы сваім майстэрствам прафесіянал — такім павінен быць актор, — патрабаваў Канстанцін Сяргеевіч. «Зрабіць цяжкое лёгкім, лёгкае прывычным, прывычнае прыгожым», — вось ступені да майстэрства. Творчы шлях самога Станіслаўскага з'яўляецца прыкладам для ўсякага мастака. Гэты шлях станаўлення мастака, апісаны ім у кнізе «Маё жыццё», з'яўляецца прыкладам творчага гарэння. Вось чаму яго кніга стала настольнай для ўсякага тэатральнага работніка, вось чаму і пачынаючы вучань і стары вопытны артыст-майстар так прагна перачытваюць яе старонкі.

Акторскія работы Станіслаўскага па праву прылічаны да лепшых шэдэўраў сусветнага мастацтва акторскай творчасці. Стрыманы паэтычны лірызм, адмаўленне ад лішніх жэстаў, ад націску голасу, — вось чаго дамагаўся Станіслаўскі ў сваёй ігры.

Чулліва-бездапаможны і адначасова ўпарты ў барацьбе за праўду доктар Штокман, задушэўная горыч гінучага таленту Астрава, крытычны да сябе і да жыцця, але няздольны на актыўнае абурэнне палкоўнік Вяршынін, нікчэмны, непрыстасаваны да жыцця ў новых яго праявах Гаеў — знайшлі ў акторы Станіслаўскім непаўторнага выканаўца.

Кожная сыграная ім роль мела шырокі рэзананс у рускай грамадскасці. Аб выконваемых ім ролях гаварылі як аб жывых, добра знаёмых людзях, лёс якіх цікавіць і хвалюе.

Успомніўся эпізод, выпадковым сведкам якога я быў. Траурная працэсія праважала Станіслаўскага ў апошні шлях. На тратуары побач са мной — стары з развейваючыміся сівымі валасамі. Хтосьці не да месца спытаў яго: «Каго-ж гэта хаваюць?» Стары сурова адказаў: «Палкоўніка Вяршыніна...»

Так! Станіслаўскі быў камандзірам тэатральнага мастацтва, удумлівым, чулым, умелым камандзірам. Так, хавалі не толькі Станіслаўскага, хавалі вобразы, створаныя ім. Яны жылі ў памяці ўсіх, хто бачыў яго ў ролях, як жывыя і знаёмыя людзі. Гэта вобразы людзей 80-х гадоў: Вяршынін, Астраў, Гаеў і многія іншыя.

Нястомныя творчыя шуканні, барацьба за сучаснасць тэатра, за яго сугучнасць з жыццём, да якога заўсёды імкнуўся Станіслаўскі, перамаглі. Маскоўскі Мастацкі тэатр стаў лепшым тэатрам краіны Советаў.

Значэнне вучэння Станіслаўскага ў развіцці тэатральнай культуры нашай краіны — велізарнае. Вучэнне Станіслаўскага сказваецца ў творчасці і жыцці ўсіх тэатраў нашай краіны. Уплыў Станіслаўскага сказваецца і на маладых нацыянальных тэатрах, у тым ліку, вядома, і на беларускай тэатральнай культуры.

Нястрымнае імкненне да ўдасканалення і руху наперад — асноўная ўласцівасць Станіслаўскага. Вось чаму імя яго стала сцягам нашага совецкага тэатра. Яно не адыходзіць з жыцця, як не адыходзяць з жыцця яго мыслі, яго справы. Вось чаму імя Станіслаўскага будзе жыць у пакаленнях.

А. СЕГЕДЗІ.

М. ІЛЬІНСКІ

„ШТО ПАСЕЕШ— ТО Й ПАЖНЕШ"

Драматург М. Ільінскі закончыў камедыю «Што пасееш — то й пажнеш». Камедыя выкрывае прахадзімцаў, якія выкарыстоўваюць сваё службовае становішча, раскрадаюць народнае дабро і ашукваюць грамадскасць.

Друкуем урывак з першай дзеі камедыі.

Лыткін (крыху выпіўшы, уваходзіць, несучы перад сабой вялікую картонную каробку з радыёпрыёмнікам, апускаецца на лавачку, стаўляе прыёмнік і выцірае пот). Ягомасць на машыне катаецца, а ты, Лыткін, цягайся вось з такой бандурай. Жывёліна ты ўючная, Лыткін, вось хто ты.

Лізачка (адчыніўшы акно). Каму гэта прыёмнік?

Лыткін. На трэці паверх, — туды.

Лізачка. А-а-а, гэта ў восьмую кватэру — прафесару.

Лыткін. Прафесару, кажаце? Адну мінютку. А які гэта прафесар?

Лізачка. Заплаткін.

Лыткін. Дзіўна — не чуў пра такога. Хадзяін больш усё справу з рознымі шахер-махерамі мае.

Лізачка. Хі-хі... Якія гэта «шахер-махеры»?

Лыткін. Ды розныя, кунешне, каторыя размяркоўваюць, забяспечваюць, гандлююць...

Лізачка. Планавікі, снабжэнцы, эканамісты... Ну і прафесар эканомікі.

Лыткін. А-а-а... Значыць свая бражка, кунешне.

Лізачка. «Бражка». Хі-хі... Як вы смешна гаворыце... Прабачайце, я не хацела вас пакрыўдзіць..

Лыткін. Адну мінютку... (Падкручваючы свае аграмадныя светларудыя вусы). З кім маю гонар гутарыць?

Лізачка. Мяне ўсе Лізачкай завуць.

Лыткін. Вельмі прыемна. А я, кунешне, Лыткін, — Лявон Іванавіч.

Лізачка. Скажыце, Лявон Іванавіч, хто гэта прыёмнік прафесару пасылае.

Лыткін. Хто? Мой хадзяін — Жукаў, Пётр Карпавіч, кунешне. Ён вунь там, насупраць вас жыве.

Лізачка. Ах, гэты!..

Лыткін. Сур'ёзны начальнік.

Лізачка. Убачыць, што вы сядзіце замест таго, каб выконваць заданне, — будзе вам.

Лыткін (усхапіўся, азірнуўся, але не бачыць небяспекі). Хе-хе-хе... Гэта, кунешне... Але без мяне ён ні кроку... Як я ёсць адказны выканаўца, дык: Лыткін — туды, Лыткін — сюды, — усё я. Без мяне ён... хе-хе... (Узяўшы прыёмнік, ідзе ў пад'езд). Бывайце пакуль. (Выходзіць).

Лізачка. Хі-хі... Смешны які, — якраз руды таракан.

Жукаў (вышаўшы з дома). А, суседка! Добры дзень.

Лізачка (какетліва). Дзень добры.

Жукаў (падыходзячы). З сёнешняга дня мы з вамі зусім блізкія суседзі.

Лізачка. Чаму з сёнешняга?

Жукаў (фатавата). Бо буду жыць вось тут. (Паказвае).

Лізачка (здзіўлена). Ту-ут?..

Жукаў. Эге-е-е-е...

Лізачка. Але чаму-ж?..

Жукаў. Не далі ордэр таварышу Чарэмху?

Лізачка. Ну, так...

Жукаў. Што вы, што вы!.. Малады чалавек, безумоўна таленавіты, але які сябе яшчэ нічым не выявіў...

Лізачка. У параўнанні з вамі?... Так?

Жукаў. Не... З маім грамадскім становішчам...

Лізачка. Зразумела.

Жукаў. Вы не задаволены?

Лізачка. Гэта зусім не мая справа. Гэтым займаецца жылкіраўніцтва.

Жукаў. Безумоўна, безумоўна... А чаму вы не на рабоце?

Лізачка. Выходная. (У бок). Ух, нягоднік! (У голас). Прабачайце. (Замкнула вакно).

Жукаў (адзін). Нічога, ні-чо-га, — кожнаму фрукту свой час. Адарвём. (Накіроўваецца ў бок сваёй кватэры).

Лыткін (выйшаўшы з дому, да Жукава). Адну мінютку!

Жукаў. Ну?

Лыткін. Споўніў. Рад! Каб вы толькі ведалі!

Жукаў. Хіба ён дома ўжо? Прапаўнічок! А выгляд! Дзякую, Лявон Іванавіч... Чакайце... Схадзіце на базу і скажыце, каб прыслалі рабочых, — перанесці мне рэчы на новую кватэру.

Лыткін. У момант. (Пайшоў).

Жукаў. І самі прыходзьце .

Лыткін. Кунешне. (Выйшаў).

Заплаткін (выходзячы з дома). Таварыш Жукаў.

Жукаў. Я. У чым рэч?

Заплаткін. Вы яшчэ пытаеце! Я ўбачыў вас праз вакно і не мог утрымацца, каб не сыйсці ўніз. Заўважце, я сказаў: «Не мог утрымацца».

Жукаў. Вельмі ўдзячны за ўвагу, але зусім не ведаю, чым я заслужыў яе.

Заплаткін. Ах, якая скромнасць!

Жукаў (у бок). Што яму ад мяне трэба? (Уголас). Вы перавялічваеце.

Заплаткін. Ах, не кажыце! Каб вы ведалі, як гэта прыемна!

Жукаў (у бок). Нажаль, не ведаю.

Заплаткін. Вы разумееце, я столькі часу дамагаюся юбілею маёй навуковай дзейнасці...

Жукаў (у бок). Ён, здаецца, трапіў не па адрасу.

Заплаткін. Столькі трачу сіл, энергіі...

Жукаў. Нічым не магу вам дапамагчы.

Заплаткін. Ведаю. Але, калі ўсюль бачыш халоднае раўнадушша, калі ніхто не толькі не хоча арганізацыйна, але маральна... Заўважце, я сказаў: «Маральна»... падтрымаць...

Жукаў (у бок). Што ён пляце?

Заплаткін. І раптам знаходзіцца чалавек, які сваёй чулай увагай гавора...

Жукаў. Я нічога вам не гаварыў.

Заплаткін. Больш! Вы зрабілі ўчынак...

Жукаў. Што вы, што вы!

Заплаткін. Я разумею. Вы эканаміст. Вы знаёмы з маімі працамі. Вы аддаеце ім належную ўвагу і сваім учынкам вы... (Пускае слязу). Вы ім сказалі: «Цябе ведаюць, паважаюць, цэняць, — табе выказваюць сваю пашану».

Жукаў (у бок). Вар'ят!

Заплаткін. Ах, запэўняю вас, што прафесар Заплаткін гэтага ніколі не забудзе. Ён заўсёды ваш найпакорнейшы слуга. Усё, чым магу быць карысным,— патрабуйце... Заўважце, даражэнькі, я сказаў: «Патрабуйце». Вы пакарылі маё сэрца.

Жукаў. Вельмі прыемна, але чым?

Заплаткін. Ну, навошта гэтая бязмежная скромнасць?! Я ўсё ведаю.

Жукаў. Але што?

Заплаткін. Ізноў! Ну, навошта... Навошта, даражэнькі мой, прыкідацца? Ваш чалавек, які прынёс прыёмнік...

Жукаў. О, ідыёт!

Заплаткін. Ха! Вы хацелі захаваць у сакрэце, а ён... хе-хе-хе... Быў выпіўшы і выбаўтаў мне ўсё.

Жукаў. О, руды нягоднік!

Заплаткін. Не лайце... Не лайце яго, даражэнькі! Дзякуючы яму я маю вялікую прыемнасць быць з вамі знаёмым.

Жукаў. Але мне гэтая прыемнасць атручана гэтым п'яніцам!

Заплаткін. Даруйце, даруйце, яму, даражэнькі! Рад, рад буду бачыць у сябе вас за шклянкай чаю.

Жукаў. Дзякую...

Заплаткін. Дазвольце яшчэ раз паціснуць вашу благародную руку.

Жукаў. Зрабіце ласку...

Заплаткін. Даруйце, што затрымаў вас, даражэнькі. Бывайце. (Пайшоў, у дзвярах спыніўся). Ваш пакорны слуга! Заўважце, я сказаў: «Ваш пакорны слуга»!

Жукаў (адзін). Не! Гэта занадта! Годзі цацкацца! Вон! Вон к чортавай матары, вон!!

Лыткін (убег, засопшыся, і да Жукава). Адну мінютку! З якой базы рабочых узяць?

Жукаў (шалеючы ад злосці). Вы... вы... (Наступаючы на Лыткіна). Вы!..

Лыткін (адступаючы). Адну мінютку, таварыш Жукаў...

Жукаў (у халодным шале). Калі я назаву вас: «п'яны ідыёт», — вы пакрыўдзіцеся. Калі я наб'ю вам морду, — вы будзеце скардзіцца... І таму я апошні раз бачу ваша п'янае абліччa.

Лыткін. Адну мінютку. Выпіўшы, — гэта, кунешне... Але. Паспрабуйце ў такую гарачыню гэтакую дуду!

Жукаў (у роспачы гневу). Ён яшчэ разважае! (Шалеючы). П'яная...

Лыткін. Наконт — п'яная — гэта ўжо... адну мінютку! Пачакайне!..

Жукаў. Чакаць, пакуль вы наробіце яшчэ большых глупстваў! Не, не! Не!!

Лыткін (у роспачы). Але што-ж я зрабіў, кунешне?!

Жукаў (стрымліваючы гнеў). Каму вы занеслі прыёмнік?

Лыткін. Каму загадалі: трэці паверх, восьмая кватэра...

Жукаў (даючы волю гневу). Сёмая, сёмая, сёмая!.. У сёмую трэба было — Бугаеву-Малініну! Бугаеву, Бугаеву, — п'яны вы бугай!

Лыткін. Толькі ўсяго? Адну мінютку... Зараз пайду і забяру назад... (Накіроўваецца да ўваходу).

Жукаў (тупнуўшы нагой). Стойце! (У роспачы гневу). Ідыёт. Канчатковы ідыёт! Ну дзе ваша галава? Дзе?!

Лыткін. Галава, кунешне, дурная...

Жукаў. Няўжо вы не маглі ўцяміць: на ліха мне той прафесар? Вон! Вон! Каб я вас больш не бачыў. (Пайшоў у бок сваёй кватэры).

Лыткін (раптам страпянуўся). Адну мінютку!

Жукаў (ідучы). А ні секунды!

Лыткін (надбегам насяг яго, заступіў дарогу). Пётр Карпавіч, адну мінютку!

Жукаў (наступае на яго з кулакамі). Што? Што яшчэ?

Лыткін (адступаючы). Біць пасля будзеце. Адну мінютку... Ён прафесар эканоміі, — вы таксама, прабачайце, наконт блату, кунешне... Вось ён вам, выходзіць, і патрэбны.

Жукаў (хвіліну злосна глядзіць на Лыткіна, пасля ўзнятыя кулакі апускаюцца, зрок мякчэе.). А, ведаеце, — вы не такі ўжо дурань, як здаецца.

Лыткін (узрадавана). Кунешне!.. А «бугаю» гэтаму прыёмнік — у момант дастаўлю. Дайце толькі пісульку. (Падстаўляючы спіну).

Жукаў (піша пісульку). Ну, ваша шчасце, Лыткін. (Дае пісульку). Вазьміце.

Лыткін. На адной назе. (Выбягае).

Жукаў (адзін). Прафесар таксама можа прыдацца... Праз яго можна атрымаць навуковую годнасць... Кандыдат эканамічных навук. А? (І раптам, ухарска ляснуўшы сябе па калену). Ну, што-ж, кандыдат, дык кандыдат! (Шпарка ідзе ў дом).

КОНКУРС ВАКАЛІСТАЎ БССР

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР арганізуе першы ўсебеларускі конкурс на лепшае выкананне вакальна-камерных і эстрадных твораў.

Конкурс праводзіцца ў тры туры. Першы тур—адборачны—праводзяць аддзелы мастацтваў усіх абласцей БССР. Другі і трэці будуць праведзены ў Мінску 25—29 снежня 1940 года.

Для прэміравання лепшых выканаўцаў устаноўлены 8 прэмій—ад 500 да 3000 рублёў, на агульную суму 11.500 рублёў, і дыпломы.

Журы другога і трэцяга тураў узначальвае народная артыстка СССР ордэнаносец Л. П. Александроўская.

Напярэдадні асенне-зімовага сезона

НОВЫ ТВОРЧЫ ЭТАП

1 верасня Беларускі дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета пачынае асенне-зімовы сезон.

Узбагачоныя велізарным вопытам работы над дэкаднымі спектаклямі, натхнёныя незабыўнымі сустрэчамі з вялікім Сталіным і яго баявымі саратнікамі,—работнікі тэатра з новымі сіламі і энтузіязмам прыступаюць да ажыццяўлення вялікіх задач, што стаяць перад імі.

Сезон адкрыецца операй «Кветка шчасця» ордэнаносца А. Е. Туранкова. І на працягу першых-жа тыдняў Тэатр оперы і балета пакажа гледачам беларускай сталіцы ўсе спектаклі, з якімі ён выступаў на дэкадзе ў Маскве.

10 верасня тэатр пакажа гледачу оперу «Чыо-чыо-сан» Пучыні. Акторскі яна амаль гатова. У бліжэйшыя дні пачнуцца сцэнічныя рэпетыцыі. Ставіць оперу галоўны рэжысёр ордэнаносец П. С. Златагораў, дырыжыруе заслужаны дзеяч мастацтваў БССР ордэнаносец М. Э. Шнейдэрман, афармляе спектакль галоўны мастак тэатра С. Ф. Нікалаеў.

У кастрычніку і снежні беларускі глядач убачыць два спектаклі Чайкоўскага—«Лебядзінае возера» і «Чаравічкі». Гэта таксама доўг тэатра перад вялікім кампазітарам, чый юбілей у гэтым годзе адзначыла наша грамадскасць.

Балет «Лебядзінае возера» будзе паказан у новай пастаноўцы і ў новым афармленні. Ставіць спектакль галоўны балетмейстар тэатра ордэнаносец К. А. Мулер.

Оперу «Чаравічкі» ставіць рэжысёр В. М. Шахрай, афармляе С. Ф. Нікалаеў.

У лютым на сцэне тэатра глядач убачыць «Травіяту» Вердзі, у красавіку—«Казкі Гофмана» Офенбаха. Такім чынам, у рэпертуары тэатра будуць прадстаўлены тры спектаклі заходніх класікаў.

Новую беларускую оперу «Кацярына» кампазітара-ордэнаносца Н. Н. Шчэглова тэатр наменіў выпусціць у чэрвені 1941 года. Тэрмін, вызначаны тэатрам, здзіўляе: опера ў асноўным гатова, канцэртнае выкананне ўрыўкаў яе ў часе дэкады ў Маскве заслужыла высокую ацэнку і мы ў праве патрабаваць ад тэатра большай аператыўнасці ў пастаноўцы арыгінальных твораў. Зацяжка паказа гледачу оперы «Кацярына» нічым не апраўдана. На нашу думку, яна павінна быць пастаўлена тэатрам у першую чаргу.

У канцы сезона будуць паказаны два новых балеты: «Залатыя каласы» Д. Кабалеўскага ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка балета ордэнаносца А. Н. Ермалаева і «Дон-Кіхот» кампазітара Мінкуса ў пастаноўцы К. А. Мулера.

Такім чынам, рэпертуар Тэатра оперы і балета ў новым сезоне папоўняць восем новых спектакляў. Разам з дэкаднымі і ранейшымі пастаноўкамі («Русалка» Даргамыжскага, «Царская нявеста» Рымскага-Корсакава. «Бахчысарайскі фантан» Асаф'ева), у рэпертуары тэатра будзе 15 спектакляў. Гэта вялікае багацце, якое яшчэ раз сведчыць аб творчых поспехах тэатра.

***

Перад тэатрам у новым сезоне стаяць і немалаважныя арганізацыйныя задачы, з якіх асноўнай з'яўляецца сувязь з гледачом. Тэатр оперы і балета карыстаецца велізарнай папулярнасцю і любоўю. Праблема сувязі з масамі павінна стаць перад тэатрам ва ўсім яе аб'ёме. Гутарка ідзе ў першую чаргу аб творчым абшчэнні з гледачом, з рабочымі і калгаснымі масамі, аб сістэматычных творчых справаздачах на прадпрыемствах, у калгасах, аб творчай папулярызацыі старых і новых пастановак, аб сістэматычнай дапамозе рабочай і калгаснай мастацкай самадзейнасці.

Немалаважнае значэнне маюць таксама шматлікія «дробязі», з якіх складаецца абслугоўванне гледача. Кіраўніцтва тэатра павінна ўзняць перад горсоветам пытанне аб лепшым прыстасаванні гарадскога транспарта (трамвая, аўтобусаў, таксі) да патрэб тэатра, аб недапушчальнасці перарываў у забеспячэнні тэатра святлом. Нарэшце, кіраўніцтву тэатра патрэбна канчатным чынам палепшыць абслугоўванне гледача ў антрактах.

Усе гэтыя пытанні неабходна паставіць зараз, каб наведвальнік тэатра з першага-ж дня новага сезона адчуў клопаты аб ім.

І. ПРАЎДЗІН.

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА МІНСКАГА БЕЛДРАМТЭАТРА

17 жніўня спектаклем «Партызаны» К. Крапівы пачынае ў Бабруйску сваю творчую справаздачу аб дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр. У Бабруйску тэатр дасць 9 спектакляў, потым выязджае ў Гомель, дзе будзе працаваць да канца верасня.

Асенне-зімовы сезон тэатр пачне 1 кастрычніка ў Мінску. Тэатр пакажа п'есу Астроўскага «Не было ні граша, ды раптам алтын» у пастаноўцы заслужанага артыста БССР ордэнаносца М. А. Зорава. Тэатр рыхтуе і п'есу Лопе дэ Вега «Дура для іншых, разумная для сябе» у пастаноўцы заслужанага артыста БССР ордэнаносца В. Я. Галаўчынера.

У рэпертуарным плане новага сезона таксама п'еса «Рамео і Джульета» Шэкспіра, пераклад якой на беларускую мову робіць драматург-ордэнаносец К. Крапіва.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

ШЫРОКА ПАКАЗАЦЬ ОПЕРНАЕ МАСТАЦТВА

З часу ўзнікнення ў нашай рэспубліцы опернай студыі, а пасля і Тэатра оперы і балета, Магілёў толькі адзін раз бачыў на сцэне свайго тэатра оперу.

Прайшлі годы. У рэспубліцы вырас выдатны Оперны тэатр. На дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве Тэатр оперы і балета БССР атрымаў дастойную высокую ацэнку.

Думаем, што варта было-б Опернаму тэатру паказаць сваю работу ў абласных цэнтрах нашай рэспублікі. Улічваючы немагчымасць выезду Опернага тэатра ў поўным складзе (невялікія сцэны і памяшканні для аркестраў, параўнаўча малая колькасць месц у тэатрах і г. д.), мяркуем, што Оперны тэатр лёгка можа вылучыць частку трупы з аркестрам, хорам, балетам і наведаць абласныя цэнтры і гарады Беларусі.

Глядач, загадзя можна сказаць, будзе задаволен і ўдзячан. Ды гэта і зразумела, бо наш глядач мае магчымасць бачыць драматычныя спектаклі, аперэту, але гадамі не бачыць і таму нават добра не ведае такога важнейшага віда мастацтва, як опера.

Г. КАЛАТНОВЕР.

г. Магілёў.

Кіностудыя «Мосфільм» здымае новы мастацкі фільм «Суvoраў» аб вялікім рускім палкаводцу. На здымку: кадр з фільма — Суvoраў—артыст Н. П. Чэркасаў (злева) і Баграціон — артыст С. А. Кілігін. Фотаклішэ ТАСС.

СЦЭНАРЫІ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ КІНОСТУДЫІ

Сцэнарны аддзел кіностудыі «Савецкая Беларусь», падрыхтоўваючы сцэнарыі для пуска ў вытворчасць, асноўнай сваёй задачай лічыць прыцягненне ў першую чаргу беларускіх пісьменнікаў, якія-б у поўнай меры маглі адлюстраваць ў мастацкіх кінавобразах сёнешні дзень квітнеючай Савецкай Беларусі.

Прыход беларускіх пісьменнікаў у кінематаграфію ўскладняўся тым, што доўгі час студыя працавала ў адрыве ад асноўнай масы беларускіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, прыцягваючы іх да работы толькі час ад часу.

Зараз, калі студыя «Савецкая Беларусь» працуе ў Мінску, пісьменнікі, кампазітары і мастакі маюць поўную магчымасць актыўна ўключыцца ў работу па стварэнню нацыянальнай кінематаграфіі Савецкай Беларусі.

У гэтых адносінах павучальны прыклад многіх буйнейшых пісьменнікаў Савецкага Саюза, якія паспяхова працуюць у кінодраматургіі, ствараючы поўнацэнныя мастацкія кінотворы—Вс. Вішнеўскі, Ал. Талстой, П. Паўленка, Н. Ціханаў, К. Паустоўскі і інш.

Рад пісьменнікаў БССР ужо ўключыліся ў работу па стварэнню беларускай кінодраматургіі. Пісьменнік-ордэнаносец Міхась Лынькоў заканчвае работу над сцэнарыем пад умоўнай назвай «17 верасня»—аб гістарычным з'яднанні беларускага народа ў братняй сям'і народаў вялікага Савецкага Саюза. У сцэнарыі будуць дадзены вобразы беларускіх сялян, смелых, валявых, непрымірымых у барацьбе супроць сваіх прыгнятальнікаў — польскіх паноў.

Над цікавай тэмай аб перамаганні пачуцця дробнаўласніцкага індывідуалізма ў савецкай вёсцы працуе пісьменнік Міхась Клімковіч. Гэта музычная камедыя — «Апошні вечар на хутары», якую аўтар павінен у бліжэйшы час здаць кіностудыі.

Пісьменнік Алесь Якімовіч здаў ужо сцэнарый «Асілак Ільюшка». Гэта мастацкі кінотвор на матэрыяле беларускіх народных казак. Сцэнарый атрымаў добрую ацэнку, прынят студыяй і ў асноўным ухвален Камітэтам па справах кінематаграфіі да пастаноўкі.

Вядомы беларускі паэт заходніх абласцей Максім Танк напісаў сцэнарый «Бура над Нараччу»—аб гістарычным паўстанні ў 1935 годзе беларускіх рыбакоў на возеры Нарач. Сцэнарый у асноўным зацверджан студыяй і Камітэтам.

Апрача таго, працуюць над сцэнарыямі для студыі пісьменнікі Янка Маўр, В. Вольскі, Е. Рамановіч і інш. Далі сваю згоду працаваць над сцэнарыямі пісьменнікі-ордэнаносцы Зм. Бядуля, Кандрат Крапіва і пісьменнік К. Чорны. Пачынаюць работу у кінодраматургіі маладыя пісьменнікі Стаховіч, Цітоў і інш.

Такім чынам нам удалося ўжо зараз прыцягнуць многіх пісьменнікаў БССР да работы ў кіно. Але спыняцца на гэтым ні ў якім разе нельга. Гэта толькі пачатак. І кіностудыі і Саюзу пісьменнікаў неабходна дабіцца таго, каб большасць пісьменнікаў уключылася ў работу па напісанню сцэнарыяў, бо з кожным годам прадугледжан рост прадукцыі кіностудыі не толькі якасны, але і колькасны.

Сцэнарным аддзелам кіностудыі прыцягваюцца да работы над сцэнарыямі не толькі беларускія пісьменнікі, але і пісьменнікі братніх рэспублік.

Ужо здаў сцэнарый «З усякім можа здарыцца» (аб ролі жанчыны на чыгуначным транспарце) рускі драматург Барыс Рамашоў. Пісьменнік Ф. Кнорэ заканчвае сцэнарый на абаронную тэму—«Стралковая рота». Пісьменнікі Зеновін і Шапавалаў здалі студыі сцэнарый «За Беларусь савецкую». Гэта гісторыка-рэвалюцыйны сцэнарый аб гераічнай барацьбе беларускага народа пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна за савецкую сацыялістычную Беларусь і аб ролі правадыра народаў таварыша Сталіна і яго баявых саратнікаў Фрунзе, Свярдлова, Орджанікідзе ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці.

Сцэнарыст К. Васіленка піша сцэнарый «Палешукі»—аб жыхарах Палесся, новых узаемаадносінах людзей, аб сацыялістычнай перабудове краю. Сцэнарый «Каханая», аб ролі камсамола ў барацьбе за высокі ўраджай ільну ў калгасах БССР, піша сцэнарыстка З. Маркіна. Пісьменнік А. Аўдзеенка працуе для нашай студыі над сцэнарыем «Гаспадар»—аб барацьбе старшыні гарадскога савета, былога чыгуначнага машыніста, за добрабыт горада. Сцэнарыст В. Ласкін піша сцэнарый «Прэм'ера»—аб узаемаадносінах у савецкай сям'і, аб пачуццях, імкненнях маладых савецкіх людзей.

Л. Кацовіч заканчвае для кіностудыі музычна-эксцэнтрычную камедыю «Сервіс» аб бытавым абслугоўванні насельніцтва.

Ужо зацверджаны Камітэтам сцэнарыі І. Бражніна «Песня аб дружбе»—кінавадэвіль аб новай маралі савецкіх грамадзян і «Карнавал»—кароткаметражная эксцэнтрычная камедыя на спартыўным матэрыяле.

Зараз над заяўкамі для нашай студыі працуюць пісьменнікі і сцэнарысты Е. Памешчыкаў, Леанід Салаўёў, С. Кананыкін, М. Берасцянскі і інш.

Сцэнарны аддзел кіностудыі ў сваёй рабоце імкнецца да таго, каб ідэйна-мастацкі ўзровень кінасцэнарыяў адпавядаў задачам, пастаўленым перад савецкай кінематаграфіяй партыяй і ўрадам. Гэта тым больш трэба мець на ўвазе, бо якасць фільма перш за ўсё залежыць ад якасці літаратурнага сцэнарыя.

Л. КАЦОВІЧ.

Нач. сцэнарнага аддзела кіностудыі.

ДВА СПЕКТАКЛІ

Бабруйскі калгасны тэатр

Малады калектыў Бабруйскага калгасна-саўгаснага тэатра мае ў сваім складзе здольных, жадаючых працаваць і расці актораў. Але частыя змены мастацкага кіраўніцтва, адсутнасць сур'ёзнай сістэматычнай вучобы перашкаджаюць творчаму росту калектыва. Гэта акалічнасць часам парадзжае шкодныя, дэмабілізацыйныя настроі, неспрыяючую паляпшэнню якасці работы атмасферу. І ўсё-ж такі калектыў тэатра, упарта перамагаючы цяжкасці ў пошуках свайго далейшага творчага шляху, папаўняе рэпертуар новымі спектаклямі. Праўда, якасць гэтых спектакляў вельмі разнастайная і пакуль што не можа вызначыць творчага твару тэатра.

Вось дзве апошнія работы тэатра: «Сады квітнеюць» Масса і Кулічэнкі і «Пагібель «Надзеі» Германа Гейнерманса.

Гісторыя работы тэатра над камедыяй «Сады квітнеюць» даволі сумная. Распачаў і не давёў яе да канца рэжысёр, якога дырэкцыя вымушана была аслабаніць ад работы. Скончыў пастаноўку спектакля актор тэатра Оўштэйн. Пераходзячы з рук у рукі, спектакль у выніку атрымаўся не зусім добраякасны.

Вобраз садавода-мічурынца Карпа Іванавіча, які па сутнасці з'яўляецца асноўным персанажам спектакля, не задавальняе гледача. Карп Іванавіч—стары інтэлігент, які не хоча адстаць ад сучаснасці. Яго светапогляд фарміруецца ў працэсе ўзаемаадносін з акружаючай яго моладзю. І гэта ён вельмі добра разумее. Вось чаму так балюча ён успрымае кожную зробленую ім памылку, вось чаму ён так пільна сочыць за сваімі паводзінамі. «Вы думалі, што мы старыя, дык мы адсталі ад жыцця,—кажа ён і за сябе і за свайго прыяцеля—вартаўніка Сверчка,—памыляецеся!»

У гэтых словах як-бы сфармуліраван увесь сэнс п'есы, яе асноўная думка. І пастаноўшчыкі і актор, што выконвае ролю Карпа Іванавіча (Я. Карначык), як відаць, не ўлічылі гэтага.

У спектаклі адчуваецца жаданне данесці да гледача камічныя, смехатворныя сітуацыі, але і гэта часам выходзіць неяк няўдала. Так, напрыклад, зусім страціў свой «арамат» недарэчны канфлікт паміж адвечнымі сябрамі—вучоным-садаводам і вартаўніком. У аўтараў—гэта найбольш удалае месца п'есы.

Тэмп, рытм спектакля не адпавядае камедыі. Усё адбываецца неяк павольна, месцамі нават недапушчальна млява.

Цяжкавесным атрымаўся Уладзімір (арт. Чэркас), многа непатрэбнай сантыментальнасці ў яго жонкі Тані (арт. Садоўская). У пошуках позы праводзіць усю сваю ролю арт. Машовіч — шофер Раманыч.

Правільна і ўдала зроблена роля Пятра (арт. Оўштэйн). Добрае ўражанне пакідаюць арт. Груздз—выканаўца ролі Наталіі Кузьмінічны і арт. Гуняжэнка—Сверчок.

Сур'ёзнай работай тэатра, у якой найбольш выяўлены яго творчыя магчымасці, з'яўляецца спектакль «Пагібель «Надзеі». Іменна з гэтага пункту гледжання «Пагібель «Надзеі»—дасягненне тэатра на шляху яго далейшага росту. Тут кожны вобраз мае свой індывідуальны характар, тут людзі іменна жывуць, удзельнічаюць у падзеях. І ў гэтым асноўная, дадатная якасць спектакля.

Вось удава рыбалова Кніпт'е. Яна любіць сваіх двух сыноў Герта і Барэнда, але суровая рэчаіснасць прымушае яе пасылаць іх на пагібель... У маці адзіная надзея: бог не дапусціць пагібелі. Гэтая надзея з'яўляецца для яе неабходнасцю, тым больш, што ўладар гандлёвых суднаў Бос патрабуе, каб яе сыны пайшлі ў дальняе плаванне. Інакш—голад і жабрацкае існаванне. Але судно «Надзея» гіне ў моры разам з людзьмі. Разам з ім гіне і надзея ўдавы Кніпт'е, старога Сымона, цёткі Трюс і многіх такіх як яны—удоў і сірот. Гіне надзея на бога, надзея на пана Боса.

Правільна зразумеў п'есу рэжысёр-пастаноўшчык, правільна, у асноўным, зразумелі свае задачы і акторы-выканаўцы.

Ёсць, безумоўна, у спектаклі рад пастановачных і акторскіх недахопаў, недапрацаваных месц (няправільныя акцэнты, неапраўданыя мізансцэны, часам «душераздирающая» меладраматычнасць), але спектакль увогуле дасягае сваёй мэты.

Артыстка Груздз (удава Кніпт'е) знайшла для свайго вобраза неабходныя фарбы. Хацелася-б толькі, каб яе мацярынская любоў была сагрэта яшчэ большай цеплынёй.

Сугуба драматычна вядзе сваю ролю арт. Шаферман. Яго Барэнд быў-бы больш пераканаўчым, калі-б пазбавіўся залішняй мітусні і надрыву ў голасе.

Правільна іграе арт. Чэркас ролю Боса, але Бос чамусьці пры ўсіх абставінах і ўмовах аднолькава грозны і зверападобны. Гэта зніжае якасць вобраза.

Моцную фігуру старога рыбалова Сымона стварыў артыст Гапавач. Актору асабліва ўдалося месца, дзе Сымон кідаецца з нажом на свайго гаспадара.

Цікава вырашан вобраз бухгалтара Капса (арт. Карначык). Не дрэнна вядуць свае ролі артысты Гулiевіч, Атаманаў, Гучко.

Трэба спадзявацца, што Бабруйскі калгасны тэатр хутчэй ліквідаваць недахопы сваёй работы, замацаваць свае дасягненні і дабіцца далейшых творчых поспехаў. Для гэтага ў яго ёсць усе магчымасці.

Барыс САВІЧ.

„Каварства і любоў"

Прэм'ера Дзяржаўнага польскага тэатра БССР

Гэтымі днямі Дзяржаўны польскі тэатр *БССР на гастролях у Беластоку паказаў* сваю прэм'еру — трагедыю Шылера «Каварства і любоў». Пастаўлен спектакль мастацкім кіраўніком тэатра таленавітым рэжысёрам Аляксандрам Венгерка.

Стрымліваючы дыханне, гледачы сачылі за трагічнымі прыгодамі Луізы і Фердынанда, — усе акторы жылі і сапраўдная кроў білася ў іх жылах. Міжвольна думалася, як мала ад 1773 года змянілася жыццё ў капіталістычных краінах, дагэтуль пануе там бяспраўе, эксплаатацыя, прыгнёт і фаспуста. Хіба інакш яшчэ год таму назад выконваў свае планы фанабэрысты пан староста, або палкоўнік з Варшавы, хіба менш подлыя і крывавыя былі іхнія інтрыгі? Хіба інакш адносілася да сваёй магчымай суперніцы — малай экспедытаркі магазіна, ці машыністкі — далікатная каханка гэтага старосты або палкоўніка?

Найцікавейшым аднак дасягненнем Венгеркі з'яўляецца зусім новая і арыгінальная трактоўка большасці дзеючых асоб трагедыі. Яго сакратар Вурм (ролю выконвае артыст Яцэк Вашчаровіч) не ёсць, як прывыклі яго бачыць на сцэне польскіх тэатраў, пачвара. Яго паказвалі як стварэнне (бо нават цяжка было тут ужыць слова чалавек) дэгенерыраванае і фізічна і маральна. У творчай фантазіі Венгеркі Вурм з'яўляецца проста прадуктам умоў, у якіх жыве, рэзультатам гангрэны, якой заражон капіталістычны лад. У гэтай трактоўцы ён больш зразумелы, нічога не мае ў сабе ад дэмана, а ўсё ад чалавека, які вымушан змагацца, як шакал, каб яго не зжэрлі такія-ж шакалы. Апошняя сцэна, у якой Вурм прагне справядлівасці, узрушае гледача.

Па-новаму падышоў Венгерка і да ролі лэдзі Мільфорд. Дагэтуль яна была проста надушаным, стракатым папугаем, які са штучным пафасам дэкламіраваў. Лэдзі Мільфорд у інтэрпрэтацыі Ірэны Бароўскай жыве поўным жыццём, шмат ёсць у ёй праўдзівага трагізма, дастоінства, жаноцкасці. Гэта найбольш пераконваючая роля ва ўсім спектаклі.

Рэшта калектыва — артысты, якія іграюць Фердынанда, старога Мілера, прэзідэнта Вальтэра — стаяць на вышыні задання. Хоць яшчэ слаба выконвае сваю ролю, але падае надзеі выканаўца ролі Луізы — маладая адароная артыстка. Яна не зжылася яшчэ са сцэнай, ёй нехапае патрэбнай актору свабоды руху. Добрыя ў эпізодах Сташэўскі (дварэцкі) і іншыя.

Неабходна спецыяльна падкрэсліць значную ролю, якая выпадае на польскі Дзяржаўны тэатр БССР. Польскі рабочы атрымаў першы раз у жыцці магчымасць трапіць у тэатр (раней гэта было прывілегіяй буржуазіі і дробнага мяшчанства) і непасрэдна пазнаёміцца з мастацтвам, паданым яму на роднай мове. А кожнаму зразумела, наколькі каштоўная і пачэсная гэтая справа.

Елена СЭЛЬМ.

ГАННА ДАБЖЫНСКАЯ

ЯБЛЫЧКІ І ЛЯЛЬКА

Апавяданне

Наймаладзейшая дачка гаспадара называлася Сабіна. Сабіна Фрончак. З ёю іменна падружыла я ў гэта лета. Была яна маёй равесніцай, мела шэсць год. Маленькая, крыху прысадзістая, на левай шчочцы—радзімы знак: чорная гарошынка. Калі-б мне давялося яе сустрэць, пазнала-б хоць сёння па гэтай гарошыны.

Я не хадзіла яшчэ ў школу, а яна мела ўжо свае абавязкі: ганяла на пашу кароў, памагала матулі гаспадарыць, а найчасцей—пільнавала агарод. Я больш за ўсё любіла дзяліць з ёю іменна гэты апошні занятак. Дапамагалі нам два сабакі—Сабінін «Бурка» і мой «Букецік».

У агародзе... не, гэта не быў звычайны агарод. Пачынаўся ён алеечкай, высаджанай па абодвух баках кустамі руж і залацістымі пучкамі рэзеды. Там, дзе канчалася алеечка, стаяў вялікі шалаш. Тут перахоўваліся фрукты, а ў непагоду—людзі шукалі схову. Направа ад шалаша быў агарод, налева—сад. У гэтым садзе міналі сонечныя дні нашага лета. Было тут прыгожа, прыгажэй быць не магло нідзе: з кожнага дрэва пахла, яснела, свяцілася. Дрэвы надрываліся пад цяжарам груш, яблыкаў і слівак, атрасаючы свае паспелыя фрукты ў мяккую, пушыстую травіцу. На траўцы скакалі маленькія жвавыя жабкі, часам бачылі нават і вожыка. У чыстым паветры прапавіта гулі залацістыя пчолкі і лёталі матылькі, як рознакалёрныя кветкі. Дрэвы аж звінелі ад птушынага цвірыкання. А мы з маёй Сабінай садзіліся ў цяньку і гутарылі, расказвалі сабе аб усім. Я гаварыла аб горадзе, а яна — аб вёсцы.

Праўду кажучы, яна мяне палохала. Расказвала яна пра Мацейку-знахарчука, што жыве ля млына і мае нядобрыя вочы: калі яго сустрэнеш, трэба ўцякаць, што ёсць сілы ў нагах, бо можа сурочыць. Пра цыганаў, што ходзяць па вёсках з песнямі і танцамі і крадуць дзяцей. Аб такіх паводках, што могуць затапіць цэлую вёску так, што з-пад вады хат не ўбачыш. Аб галодных ваўках, якія вылазяць з лесу, падыходзяць да самых вясковых двароў—і тады кожны павінен дрыжаць за сваё жыццё. Аб мяцеліцах, якія засыпаюць дарогі вялікімі гурбамі снегу і ў якіх загінуў не адзін заблуджаны падарожнік.

Я дрыжала ад страху, слухаючы такія апавяданні, аднак заўсёды слухала з вялікім захапленнем. Некаторыя яна пераказвала мне па некалькі разоў. Я давядалася пра многае, зусім для мяне новае. Хвараюць, аказваецца, не толькі людзі, але дрэвы, птушкі і звяры. Летась у іх садзе захварэлі на чорную каросту дрэвы. Тады ейны бацька выдумаў такую мазь, што вылечыў іх. Глянь, як урадзілі сёлета! Аднойчы прыляцеў кульгавы бусел—меў зламаную ножку. Бацька ўзяў ножку ў ляшчоткі, добра абвязаў, і наш бусел хутка захадзіў так, што трымай! Хай толькі ў вёсцы захварэе карова альбо свіння—адразу клічуць ейнага бацьку. Ды не толькі ў вёсцы—што там вёска!—клічуць нават у маёнтак, да пана барона...

Пан барон магутны і багаты, як цар, і жыве ў прыгожым палацы... Парк там такі, што можна ў ім заблудзіцца. У парку стаў, на ставе плаваюць лебедзі... У барона чатыры сыны, якія страляюць так метка, што забіваюць птушак на-ляту... Двор пільнуюць вялізныя сабакі-брытаны, — здаралася, што чужых загрызалі насмерць. І столькі ў барона служак, што на кожную работу—іншы... Дык нават гэты пан барон... не раз клікаў да сябе ейнага бацьку...

І тут пачыналася апавяданне пра яблыкі.

Барон сказаў прывезці іх з далёкай замарскай краіны і даручыў свайму садоўніку пасадзіць у садзе. Яны не хацелі прымацца, сохлі. Тады барон паклікаў ейнага бацьку і загадаў, каб ён пасадзіў дзве яблыні ў сваім садзе. Бацька пасадзіў. Прыняліся. Але да другіх зусім не падобны: цвітуць жоўтым цветам, пахнуць так салодка, што, панюхаўшыся, можна заснуць насмерць. Да яблыкаў нельга было нікому дакрануцца. Кожны год падыходзяць людзі з двара і забіраюць іх на залатых місах. Яблыкі гэтыя нават не абтрасаюць, а проста знімаюць з дрэва, кожнае асобна.

—Дык якія-ж гэта яблыкі?

—Зачараваныя...

—А як выглядаюць?

—Днём чырвоныя, цёмначырвоныя, амаль чорныя. Але ноччу свецяцца, як зоркі, і звоняць, а на ветры іграюць, як музыкі.

—Чаму-ж яны іграюць?

—Хто-ж можа ведаць... Зачараваныя... У кожным яблыку шкляны шарык, а ў ім—залатыя зярняткі... Вецер сколане—іграюць...

Што-ж ёй магла за гэта расказаць я, чым заманіць, заахвоціць? І расказала ёй аб горадзе, аб вазах, што самі едуць, ніхто іх не цягне і не папіхае, у сярэдзіне сядзіць чалавек і круціць кола направа і налева, і тады воз закіроўваецца сам, едучы ў бок альбо проста. Але Сабіна гаварыла, што ўсё гэта — чары, і як я ні тлумачыла ёй—слухала цярпліва, але не верыла. Паўтарала, што гэта — чары. І ў тэлефон, і ў электрычнасць таксама не верыла. І таксама ў тое, што людзі на машынах лётаюць у паветры. Што-ж рабіць?—прашу, каб паказала мне гэтыя яблыкі так, дарма, за нішто. Гэтак яна баялася нечага, што нельга на іх нават глянуць. Тады я хацела аддаць ёй усё маё багацце: ключык, ланцужок, які ёй так падабаўся, нават алоўак. Нічога не памагло.

Тады здарылася нешта нечаканае. Аднойчы прыехаў з горада мой бацька і прывёз мне лялькў. Што гэта была за лялька! Блакітнавокая, з доўгімі цёмнымі расніцамі, мела светлыя валасы і была прыгожа апранута. Гэта яшчэ не ўсё. Мая лялька прачыналася і засынала! Даволі было папрасіць: «Спі, спі, лялечка!»—яе вочкі плюшчыліся. «Прачніся, соня!»—і расплюшчвала лялька вочы. «Кім будзе для мяне гэта паслухмяная дачушка?»—спытаўся бацька, песцячы лялькў. «Ма-ма!...»—адказвала лялька.

Скачучы з радасці, я кінулася бегчы да Сабіны, каб безупынна гаварыць і гаварыць ёй аб маім вялікім шчасці.

Цяпер быў мой верх.

***

Гутаркі аб ляльцы заняпалі сабой усё другое. Толькі аб ёй гаварылі мы цэлымі днямі. Сабіна зноў казала, што гэта—чары. Не магла зразумець, што лялька сапраўды заплюшчвае вочы і гаворыць, такая думка не магла змясціцца ў галаве Сабіны.

Заламвала рукі—аж пальцы хрусцелі, маленькі гарошак на шчочцы ўздрыгваў. Але мяне самую ўсё яшчэ мучыла таямніца панскіх яблыкаў. Снілася мне, што на двары ноч і толькі яны свецяцца, асляпляюць сваім бляскам. Кожнае яблыка кібы малое чырвонае сонейка. Я чула іх спеў. І аднойчы—упрасіла ўсё-такі Сабіну. Пакажу ёй сваю лялькў, а яна няхай пакажа яблыкі.

Што-ж ёй засталося рабіць?

Назаўтра раніцай, таячыся, выцягнула я лялькў са шкапа, пабегла да Сабіны. Было яшчэ вельмі рана, але яе не было ў хаце, была ўжо, мусіць, у садзе. Сонечная раніца рассявала сваю праменную звонкую прыгажосць. Была я на ўсё гэта сляпая і глухая. Па дарозе круціўся вятрак, махаючы сваімі чорнымі рукамі, і здавалася, што ён пераліваае яскравыя палосы святла. Я нават не аглянулася, хоць ён быў маім сябрам. Прыпомніўся мне Мацейка—пабегла яшчэ хутчэй, за мною гнаўся «Букецік».

Сабіна, нічога не гаворачы, узяла лялькў і пайшла са мною ў глыбіню сада. Ішлі мы доўга. Яблыні стаялі крыху воддалі ад іншых дрэў—вялікія, развесістыя, нахіляючыся пад цяжарам пладоў. У светлым лісці звісалі цёмначырвоныя, амаль чорныя шары яблыкаў. Зусім якбы нехта іх нарысаваў. Знямелая перад іх красой стаяла я. Калі аглянулася, Сабіны пры мне ўжо не было. І тады, у адзін міг, я абняла цёмны пень і ўзлезла на яблыню. Круцілася галава. Здалося мне, што бачу злосны твар барона, бачу яго чатырох сыноў, страляючых проста ў мяне, вялізных з разяўленымі і аскаленымі мордамі сабак-брытанаў, але—нічога, зацiснула зубы і шпаркім рухам сарвала яблыка. Саскаўзнула з дрэва і кінулася наўцёкі. Сабіны нідзе не было відно. І раптам захацелася мне пераканацца зараз-жа, у гэтую-ж хвіліну, як выглядае яблыка ўнутры. Асцярожна абгрызла яго з усіх бакоў, каб не зламаць шклянога шарыка з тымі залатымі зярняткамі. Грызла і грызла салодкі пахучы мякіш, а шарыка ўсё не было. Дабралася да зярнят,—пасыпаліся цвёрдыя, чорныя, такія самыя, як зярняты ўсіх нашых яблыкаў. Сабіна зманіла! Не было ў ім ні шкляного шарыка, ні залатых зярнят...

Я кінулася шукаць яе, гукала голасна, з усёй сілы, але ніхто не адгукнуўся, нідзе яе не было відно. Хацела ўжо ісці дамоў, але—як ісці без лялькі? Трэба яе зноў палажыць на месца. Агортваў мяне ўсё больш і больш жаль. Плачучы, заглянула я ў шалаш.

Тут сядзела Сабіна на маленькім услончыку, зусім не кратаючыся, як-бы акамянелая. У адной руцэ трымала цвік, у другой камень. На каленях ляжала лялька. Лялька!.. мая слаўная лялька. Дзе твае вочы?! На месцы вачэй—дзве пустыя ямкі. Залацістыя валасы валяюцца на зямлі, цягае іх «Бурка». Чырвоны роцік, у якім не было ўжо чубкоў, скрывіўся, здалося, на плач.

Сабіна тупа глядзіць у адзін пункт і, здавалася, усміхаецца...

Пераклад з польскай мовы **В. ТАУЛАЯ.**

— ⊙ —

Тэатральныя навіны

⊙ У Гомелі з поспехам праходзяць гастролі Смаленскага абласнога рускага драматычнага тэатра. Тэатр дасць у Гомелі 20 спектакляў.

⊙ 20 жніўня ў Смаленску пачнуцца гастролі Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра БССР. Апрача свайго асноўнага рэпертуара, тэатр пакажа дзве новыя п'есы: «Два кунелемлех» Гольдфадэна ў апрацоўцы А. Платнера і Е. Вінагура і «За акіянам» Гордзіна.

⊙ 18 жніўня ў Смаленску заканчвае свае гастролі Тэатр музыкальнай камедыі БССР.

⊙ 10 жніўня спектаклем «Загавор» Вірта аднаўляе свае гастролі ў Мінску Рускі драматычны тэатр БССР. Тэатр пакажа спектаклі: «Каварства і любоў» Шылера, «Таленты і паклоннікі» Астроўскага, «Крэмлёўскія куранты» Пагодзіна і іншыя.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Уп. Галоўлітбела № Т—1573.